ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Нядзеля, 27 лютага 1938 г., № 11 (353)

Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення ССПБ і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

На аснове Сталінскай Канстытуцыі

26 лютага адкрылася VIII сесія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР. Сесія абгаворыць і зацвердзіць «Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР».

Грунтуючыся на Сталінскай Канстытуцыі СССР і Канстытуцыі БССР, «Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» вызначыць выбарчую сістэму, парадак складання спісаў выбаршчыкаў, арганізацыю выбарчых акруг, парадак выстаўлення кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, парадак галасавання і г. д.

Выбарчы закон, які будзе зацверджан сесіяй, паслядоўна і да канца рэалізуе вялікія ідэі соцыялістычнага дэмакратызма, агалошанага Сталінскай Канстытуцыяй.

Выбарчы закон БССР адлюструе перамогу соцыялістычнага ладу, дзяржаўнае кіраўніцтва рабочага класа совецкім грамадствам. Ад першага да апошняга радка ў ім пройдзе думка аб рэальным забеспячэнні ўсеагульнага, роўнага, прамога выбарчага права пры тайным галасаванні.

Апублікаваны праект «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» ясна і чотка вызначае ўмовы, якія забяспечваюць шырокае, сапраўды дэмакратычнае волевыяўленне беларускага народа. Як і пры выбарах у Вярхоўны Совет СССР, устанаўляецца такі парадак правядзення выбараў, пры якім кожны грамадзянін, што валодае правам голасу, зможа выканаць свой высокі грамадскі абавязак.

«Выбары ў Вярхоўны Совет СССР прадэманстравалі перад усім светам жалезную маналітнасць магутнага совецкага народа, яго непахісную аддансць ідэям комунізма, яго беззаветную любоў да партыі Леніна—Сталіна. Бліскучы поспех сталінскага блока комуністаў і беспартыйных на выбарах у Вярхоўны Совет СССР з'явіўся яркім сведчаннем таго, што палітыка сталінскага Цэнтральнага Камітэта і совецкага ўрада падзяляецца і падтрымліваецца ўсім шматнацыянальным народам». («Правда»).

Прайшоўшыя выбары ў Вярхоўны Совет СССР з'явіліся грознай перасцярогай для ўсіх ворагаў нашай соцыялістычнай радзімы, якія падрыхтоўваюць напад на Совецкі Саюз, бацькаўшчыну працоўных усяго свету. Няхай ведаюць фашысцкія падпальшчыкі вайны, што нельга перамагчы магутны шматмільённы народ, аб'яднаны, спаяны ў жалезную кагорту пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і вялікага Сталіна.

Беларускі народ, які ніколі ў гісторыі не меў сваёй дзяржаўнасці, тэрыторыя якога была плацдармам шматлікіх еўрапейскіх войнаў, дзякуючы Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, дзякуючы вялікай партыі Леніна—Сталіна, братняй дапамозе слаўнага рускага народа стварыў сваю дзяржаўнасць і з'яўляецца роўным сярод роўных, займае ганаровае месца ў сузор'і адзінаццаці совецкіх соцыялістычных рэспублік вялікага Совецкага Саюза.

Сталінская Канстытуцыя і сталінскі выбарчы закон носяць глыбока інтэрнацыянальны характар. Яны з'яўляюцца велізарнейшымі дакументамі дружбы народаў, нізвергнуўшых капіталістаў і памешчыкаў і будуючых шчаслівае комуністычнае жыццё, дакументамі, якія натхняюць прыгнечаныя народы свету на барацьбу з капіталістычнымі парадкамі, за сваё вызваленне. Прыкладам для гэтых народаў служыць гераізм нашага народа і нашай Чырвонай Арміі — самай магутнай арміі ў свеце.

БССР за годы совецкай улады, за годы сталінскіх пяцігодак ператварылася ў магутны фарпост вялікага Совецкага Саюза на яго заходніх граніцах. Пабудаваны гіганты прамысловасці, абсталяваныя першакласнай тэхнікай. Прамысловасць Совецкай Беларусі ў параўнанні з дарэволюцыйным часам вырасла ў дваццаць з лішнім разоў. БССР мае 22 вышэйшыя навучальныя ўстановы, 75 спецыяльных сярэдніх і тысячы сярэдніх і ніжэйшых школ. Расце і ўзмацняецца літаратура і мастацтва Совецкай Беларусі.

Калгасны лад рэзка змяніў аблічча беларускай вёскі. Мільёны калгаснікаў і калгасніц адчуваюць зараз радасць калектыўнай працы. Яны з'яўляюцца сапраўднымі гаспадарамі самай буйнай, самай магутнай у свеце сельскай гаспадаркі.

Няма ўбогай, старой вёскі з першабытнай тэхнікай. Ёсць квітнеючая Совецкая Беларусь, працоўныя якой жывуць шчаслівым, радасным, заможным жыццём. Гэтыя велізарныя поспехі здабыты рабочымі, сялянамі і інтэлігенцыяй у жорсткай барацьбе з ворагамі народа, у барацьбе з трацкісцка-бухарынскай бандай германа-япона-польскага фашызма.

На рубяжы двух светаў — соцыялістычнага і капіталістычнага — стаіць Совецкая Беларусь — неадрыўная састаўная частка вялікага СССР, яго гранітны фарпост. Рэзка процілеглыя два светы. У фашысцкай Польшчы, у фашысцкай Германіі і іншых капіталістычных дзяржавах — мільёны працоўных стогнуць пад ярмом палітычнага бяспраўя і нечалавечага прыгнечання. Пад падвойным прыгнечаннем знаходзяцца рабочыя і сяляне Заходняй Беларусі. Сяляне Заходняй Беларусі даўно ўжо забылі смак цукру. Мыла, газа, сярнічкі, соль сталі выключнай рэдкасцю ў быту заходне-беларускага селяніна. Поглядам, поўным лепшых надзей, сочаць працоўныя Заходняй Беларусі за жыццём у краіне Советаў, пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

У лагеры капіталізма — нацыянальная варожасць і няроўнасць, каланіяльнае рабства і шавінізм, нацыянальнае прыгнечанне і пагромы, фашысцкія зверствы і войны; поўнае банкроцтва спроб капіталістычнага свету сумясціць свабоднае развіццё народаў з сістэмай эксплаатацыі чалавека чалавекам; клубок нацыянальных супярэчанняў ўсё больш заблытваецца.

У краіне соцыялізма — узаемнае давер'е і мір, нацыянальная свабода і роўнасць, мірнае сужыццё і братняе супрацоўніцтва народаў.

Толькі перамога соцыялізма прынесла вызваленне шматлікім нацыянальнасцям і ператварыла іх у квітнеючыя народы, якія падняліся да вышынь культуры і навукі. Соцыялізм ператварыў гаспадарку гэтых народаў з дзікай, адсталай у перадавую індустрыяльную і калгасную, — знішчыў векавую варожасць нацыянальнасцей і зліў іх у адзіную сям'ю народаў, якая ў магутным творчым парыве будуе соцыялізм, умацоўвае першую ў свеце шматнацыянальную соцыялістычную дзяржаву рабочых і сялян — дзяржаву, дзе знішчана эксплаатацыя чалавека чалавекам, дзе вялікія ідэі Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна, ідэі комунізма авалодалі масамі, якія высока ўзнялі пераможны сцяг комунізма.

Пасля зацверджання сесіяй выбарчага закона Совецкая Беларусь уступае ў першы этап выбарчай кампаніі. Задача совецкіх літаратараў і работнікаў мастацкага фронта заключаецца ў тым, каб скарыстаць накоплены вопыт і найлепшым чынам удзельнічаць у правядзенні выбараў. Яны абавязаны паказаць у сваіх творах вобраз сталінскіх выхаванцаў—кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Беларускі народ з велізарнейшай актыўнасцю прышоў да выбарчых скрынак 12 снежня 1937 года і аднагалосна прагаласаваў за партыю большэвікоў, за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

Выбары ў вярхоўны орган улады Совецкай Беларусі пройдуць з такой-жа актыўнасцю, адзінствам і згуртаванасцю вакол ЦК нашай партыі, як гэта было ў часе выбараў Вярхоўнага Совета СССР.

Сталінская Канстытуцыя, яе вялікія прынцыпы ўвайшлі глыбока ў жыццё, у быт, у свядомасць працоўных. Запісаныя на яе старонках правы і абавязкі грамадзян сталі неад'емнымі ўмовамі жыцця кожнага совецкага чалавека і ўсяго соцыялістычнага грамадства. На падставе сталінскага закона шматнацыянальны народ прадаўжае тварыць сваю гістарычную справу — справу соцыялізма. На падставе гэтага закона будуць праходзіць выбары Вярхоўнага Совета БССР.

ДОБРЫ ПАЧАТАК

Маладыя аўтары ўпершыню сабраліся ў Доме пісьменніка 24 лютага для абмеркавання сваіх твораў. На дапамогу ім прышлі майстры мастацкага слова — пісьменнікі тт. Бядуля і Глебка.

Творчы калектыў пачынаючых абмеркаваў апавяданне «Выпадковая сустрэча» тав. Дудо і вершы тав. Шахаўца. Тт. Бядуля і Глебка зрабілі ўдумлівы і дэталёвы разбор твораў маладых пісьменнікаў. Выступалі тав. Клімковіч, а таксама ўвесь калектыў пачынаючых.

— Апавяданне тав. Дудо напісана на хвалюючую тэму — аб выкрыцці фашысцкіх шпіёнаў. Свежасць і арыгінальнасць твора ў цікава пабудаванай, захапляючай фабуле. Здольнаму таварышу ўказалі на рад сур'ёзных заган: на аднастайнасць мовы, надуманасць і трафарэтнасць канцоўкі, наіўнасць прыёмаў, якімі дзейнічае шпіён. Тав. Бядуля на канкрэтных прыкладах паказаў тав. Дудо, што трэба перарабіць у апавяданні.

Грунтоўны аналіз верша тав. Шахаўца зрабіў тав. Глебка. Пачынаючы паэт выслухаў суровую таварыскую крытыку. Дадатным бокам яго вершаў з'яўляецца рад удалых параўнанняў і актуальнасць тэматыкі. Аднак, малады паэт яшчэ не мае ўласнага мастацкага падыходу да раскрыцця ў паэтычных вобразах нашай рэчаіснасці. Ён карыстаецца трафарэтнымі эпітэтамі і метафарамі.

Усе прысутныя пачынаючыя таварышы выказалі сваё задаволенне добрым пачынаннем габінета маладога аўтара ў галіне творчай дапамогі маладым пісьменнікам.

На абмеркаванні прысутнічала 15 маладых аўтараў.

Н.

XX ГОД РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТА

Прамова народнага камісара абароны маршала Совецкага Саюза тав. К. Е. ВАРАШЫЛАВА

на ўрачыстым пасяджэнні Маскоўскага совета Рабоча-Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў з удзелам грамадскіх арганізацый і вайсковых часцей, прысвечаным 20-годдзю Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота

ТАВАРЫШЫ!

Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот разам з усімі народамі совецкай дзяржавы святкуюць дваццацігоддзе свайго існавання.

Армія і флот пролетарскай рэволюцыі на працягу двух дзесяцігоддзяў былі верным аплотам новага соцыялістычнага грамадства і разам з сваёй дзяржавай бесперапынна раслі, удасканальваліся і к данаму моманту прадстаўляюць сабой магутную ўзброеную сілу перамогшага соцыялізма.

У годы грамадзянскай вайны Чырвоная Армія і Чырвоны Марскі Флот, складаючы перадавы баявы атрад змагаючагася народа, крывёю адстаялі сваю радзіму і вялікую справу Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Яны на-галаву разбілі і знішчылі памешчыцка-буржуазную і кулацкую контррэволюцыю, без астатку ліквідаваўшы ўсе яе ўзброеныя полчышчы. У цяжкіх і крывапралітных бітвах Чырвоная Армія і Чырвоны Флот разграмілі арміі замежных інтэрвентаў і выкінулі іх з ганьбай за межы совецкай дзяржавы.

Многія дзесяткі тысяч бясстрашных байцоў аддалі сваё жыццё за справу народа, змагаючыся ў радах Чырвонай Арміі і Чырвонага Ваенна-Марскога Флота. Імёны такіх народных герояў, як Чапаеў, Шчорс, Руднёў, Пархоменка, Лазо, Дундзіч, матрос Жэлезнякоў і многіх іншых, будуць пастаянна жыць у сэрцах пакаленняў. Аб іх удзячны совецкі народ складае свае песні, аб іх пішуць і яшчэ будуць многа пісаць кніг. Яны натхняюць нашу моладзь на подвігі і гераізм і служаць выдатным прыкладам бязмежнай адданасці свайму народу, радзіме і вялікай справе Леніна—Сталіна.

Таварышы!

7 лістапада 1917 года рабочыя і сяляне пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна звергі ўрад памешчыкаў і капіталістаў Расіі і ўзялі ўладу ў свае рукі. На свет з'явілася новая, яшчэ ніколі да таго не існаваўшая, совецкая соцыялістычная дзяржава на чале з рабоча-сялянскім урадам. З гэтага моманту разгарэлася сапраўды гераічная барацьба рабочага класа, працоўнага сялянства і ўсяго чэснага, што было ў нашым народзе, з азвярэлай расійскай контррэволюцыяй і іншаземнай інтэрвенцыяй.

Пачалася ўзброеная схватка новага, толькі што нарадзіўшагася соцыялістычнага свету з светам гвалту і злачынстваў — з светам капіталістычным. Керэнскія і Гучковы, генералы Красновы, Каледзіны, Карнілавы, Дзенікіны і Калчакі — усе гэтыя абаронцы царскага самадзяржаўя і капіталістычнага ладу, агенты замежных інтэрвентаў і многія іншыя душыцелі рускага народа ўзначалілі чорныя сілы контррэволюцыі і прабавалі ў зародку разграміць і патапіць у крыві Рэспубліку Советаў.

Узброеныя сілы маладой совецкай дзяржавы, якія складаліся ў той час з шматлікіх, але разрозненых і дрэнна арганізаваных атрадаў Чырвонай гвардыі, створаных рабочымі на фабрыках і заводах, і асобных часцей старой царскай арміі, перайшоўшых на старану пролетарскай рэволюцыі, не маглі, разумеецца, доўга процістаяць аб'яднаным сілам унутранай контррэволюцыі і іншаземнай інтэрвенцыі, у кароткі час ахапіўшай усе ўскраіны Совецкай Расіі.

Партыя Леніна—Сталіна, Рабоча-Сялянскі Урад на вопыце разгарнуўшайся крывавай барацьбы пераконваліся ў неабходнасці хутчэйшага пераходу да рэгулярнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, якая магла-б адстаяць справу рэволюцыі ад унутранай контррэволюцыі і паспяхова адбіць шматлікія рэгулярныя войскі замежных інтэрвентаў.

28 студзеня 1918 года вялікі Ленін падпісаў дэкрэт аб арганізацыі новай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, а праз 15 дзён — другі дэкрэт аб роспуску старога марскога флота і стварэнні новага Рабоча-Сялянскага Чырвонага Флота.

Наступныя падзеі паказалі, наколькі мудры і дальнабачны былі гэтыя рашэнні.

Ужо к пачатку 1919 года ўнутраная контррэволюцыя, не лічачы замежных інтэрвентаў, мела звыш 700.000 белагвардзейскіх войск, арганізаваных у атрады, дывізіі, карпусы і арміі, кіруемыя віднейшымі царскімі генераламі і генштабамі буйнейшых капіталістычных краін. Разгарнулася сапраўдная, крывапралітная, вялікая вайна.

На-смерць перапалоханае пролетарскай рэволюцыяй у Расіі імперыялістычнае звяр'ё ўсіх велічынь — ад буйных сланоў да мізэрных мосек уключна — спяшалася на дапамогу расійскай контррэволюцыі з мэтай урваць пажырней кавалак, забяспечыць за сабой долю ў грабяжы совецкага народа.

Зняты спецыяльна з імперыялістычных франтоў і кінутыя на нашу тэрыторыю войскі інтэрвентаў, разам з расійскай контррэволюцыяй, захватвалі адну за другой часці совецкай тэрыторыі. Беларусь і Украіна, Паўночны Каўказ і Закаўказзе, Паволжэ і Сярэдняя Азія, Урал, Заходняя і Усходняя Сібір, Забайкалле і Далёкі Усход, Курск, Варонеж, Орол і непасрэдныя подступы да самага Ленінграда — усе гэтыя раёны і гарады палыхалі ў вогнішчы вайны, паліваліся свяшчэннай крывёю нашых рабочых і сялян.



Германія, Англія, Францыя, Італія, ПАЗШ, Японія, Польшча, Румынія, Эстонія, Латвія, Літва, Чэхаславакія, Фінляндыя, Грэцыя — такі няпоўны пералік краін, урады якіх прыкладалі тады ўсе намаганні, каб з дапамогай сваіх войск, разам з белымі арміямі, затапіць у крыві рабочых і сялян пролетарскую рэволюцыю, заняволіць нашы народы, знішчыць іх свабоду і незалежнасць, расчляніць і разграбіць па частках совецкую дзяржаву.

Да 400.000 адборных салдат, узброеных лепшай баявой тэхнікай на чале з не менш адборнымі афіцэрамі і генераламі, рушаных указанымі дзяржавамі з поўдня, захада, поўначы і ўсхода, палілі нашы гарады і сёлы, грабілі, вешалі і расстрэльвалі совецкі народ, — словам, на справе дэманстравалі перад нашым народам сваю капіталістычную «цывілізацыю» і «культуру».

Паспяхова змагацца ў разліку на канчатковую перамогу з гэтымі сіламі ўнутранай контррэволюцыі і замежнай інтэрвенцыі маглі толькі рэгулярная, пабудаваная па ўсіх правілах ваеннай арганізацыі, Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія і Чырвоны Марскі флот.

І наша партыя разгарнула тытанічную работу па арганізацыі рэгулярнай Чырвонай Арміі і Чырвонага Ваенна-Марскога Флота, па стварэнню моцнай базы для баявога харчавання ўзнікшых ва многіх месцах баявых франтоў.

Неймаверна цяжкія былі ўмовы для гэтай работы. Страшэнная стомленасць народа ад шматгадовай імперыялістычнай вайны, разбураная і без таго нямоцная народная гаспадарка, худасочная ваенная прамысловасць, сабатаж старога чыноўніцтва ўсіх ведамстваў дзяржаўнага і грамадскага апарата — усё гэта, як здавалася многім, стаяла непераможнай перашкодай на шляху правядзення партыяй і ўрадам мерапрыемстваў па стварэнню сваіх боездольных узброеных сіл.

У дадатак да ўсяго сказанага, таварышы, унутры самой нашай партыі разгарнулі здрадніцкую работу трацкісцка-бухарынскія элементы, якія прабавалі з дапамогаю хлёсткіх, а на справе правакатарскіх лозунгаў, збіць з ленінскага шляху нашу партыю, перашкодзіць вялікаму Леніну і яго верным саратнікам ажыццяўляць адзіна правільную палітыку нашай дзяржавы.

«Не мір і не вайна», «Свяшчэнная вайна супроць сусветнай буржуазіі» — усе гэтыя і падобныя ім правакатарскія лозунгі троцкіх, бухарыных і інш. мелі адну адзіную мэту ўпутаць нашу краіну ва ўзброеную сутычку з імперыялістамі ў момант, калі Совецкая ўлада яшчэ не мела сваёй моцнай арміі, і гэтым самым ліквідаваць Совецкую ўладу і расчысціць шлях для перамогі буржуазіі і поўнай рэстаўрацыі капіталізма ў нашай краіне.

Але партыя Леніна—Сталіна, геніяльны Ленін ўсё перамаглі, разгромілі гэтых, як тады здавалася, левакомуністычных фразёраў, а на самой справе — здраднікаў і правакатараў, і, не гледзячы на ўсе труднасці, Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія і Чырвоны Флот былі створаны. У агні бітваў жорсткай грамадзянскай вайны гэтыя армія і флот складваліся ў магутную дысцыплінаваную пераможную шматмільённую сілу Совецкай дзяржавы, канчаткова разграміўшую айчынную контррэволюцыю і на-галаву разбіўшую замежных інтэрвентаў.

Наша партыя ўправе ганарыцца, таварышы, што ёй удалося стварыць такія ўзброеныя сілы перамогшага пролетарыята, якія з гонарам вышлі з цяжкага выпрабавання, адстаялі свабоду і мірную працу для рабочых і сялян вялікага Совецкага Саюза.

У чым сіла Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Чырвонага Флота

Як магло здарыцца, што галодныя, змучаныя імперыялістычнай вайной, рабочыя і сяляне нашай краіны ва ўзброенай барацьбе перамаглі арміі царскіх генералаў і міжнародных інтэрвентаў?

Як магло адбыцца, што маладая Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот, колькасна ўступаўшыя сваім ворагам, слаба ўзброеныя, цярпеўшыя нястачу ў боепрыпасах і самым неабходным, апракінулі, разбілі на-галаву шматлікія, добра забяспечаныя баявой тэхнікай арміі ўнутранай і знешняй контррэволюцыі?

Галоўная прычына бліскучых перамог Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота заключаецца ў тым, таварышы, што рабочы клас і працоўнае сялянства Расіі змагаліся за свае класавыя інтарэсы, за сваю кроўную справу, што яны, рабочыя і сяляне, самкнуліся ў цесны, брацкі саюз у барацьбе за гэтыя свае класавыя інтарэсы, за незалежнасць сваёй радзімы, за сваю народную ўладу.

Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот былі не толькі ваеннай, баявой арганізацыяй. Яны адначасова былі самай сапраўднай арганізацыяй неразрыўнай сувязі рабочых і сялян! Тут у цесным садружастве байцоў і камандзіраў — лепшых сыноў нашага народа — расла і мацнела ў баявых сутычках з ворагамі, ва ўмовах баявога паходнага жыцця, непарушная дружба, брацкі саюз рабочых і сялян.

Таварыш Ленін у адным з сваіх зваротаў да Чырвонай Арміі вясной 1919 г., растлумачваючы чырвонаармейцам мэты інтэрвентаў, гаварыў:

> «Чырвоная Армія моцная тым, што свядома і аднадушна ідзе ў бой за сялянскую зямлю, за ўладу рабочых і сялян, за Совецкую ўладу.
>
> Чырвоная Армія непераможна, бо яна аб'яднала мільёны працоўных сялян з рабочымі, якія навучыліся цяпер змагацца,... смялей і смялей ідуць на ворага, ведаючы, што блізка яго паражэнне». (Ленін, творы, т. XXIV, стар. 197).

Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот моцны тым, што яны не процістаяць народу, не пастаўлены над ім, не адгароджаны ад яго. Яны — самі складаюцца з лепшай часткі народа, служаць яму, абараняюць інтарэсы ўсяго народа, тым самым абараняючы свае ўласныя інтарэсы.

У рады Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота заўсёды ішлі перадавыя, свядомыя прадстаўнікі рабочага класа і сялянства. На ўсіх этапах грамадзянскай вайны, у самыя цяжкія моманты жыцця нашай дзяржавы, ні на міг не парывалася неразрыўная, арганічная сувязь Чырвонай Арміі з сваім народам. Армія і Флот бесперапынна і багата чэрпалі сілы з рабочых і сялянскіх мас, папаўняючы свае радзеўшыя рады. Усё лепшае, што мелася ў народзе, ішло ў Чырвоную Армію, ішло ў бой.

Пастаяннай любоўю і ўвагай акружаў народ сваю армію.

Таварыш Сталін у сваёй прамове, прысвечанай 10-годдзю РСЧА, гаварыў:

> «Нідзе ў свеце няма такіх любоўных і клапатлівых адносін з боку народа да арміі, як у нас... Наша армія ёсць адзіная ў свеце, якая мае спачуванне і падтрыманне з боку рабочых і сялян. У гэтым яе сіла, у гэтым яе моц». (Сталін. Аб трох асаблівасцях Чырвонай Арміі).

Узброеныя сілы Совецкага Саюза з'яўляліся своеасаблівым акумулятарам рэволюцыйнай энергіі і энтузіязма мільённых мас працоўных. Тут, у радах арміі і флота, гэта воля, рэволюцыйная энергія і энтузіязм рабочых і сялян, арганізаваныя і накіраваныя большэвіцкай партыяй у русла барацьбы за Совецкую ўладу, за шчасце і новае жыццё народа, нязменна давалі пераможныя, бліскучыя рэзультаты.

У гэтым была, ёсць і будзе сіла і магутнасць нашай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Гэтага пазбаўлены арміі капіталістычных краін, назначэнне якіх заключаецца ў тым, каб абараняць інтарэсы невялікай кучкі эксплаататараў-капіталістаў супроць інтарэсаў мільёнаў працоўных, супроць сваіх уласных інтарэсаў.

Старая царская армія, як і іншыя буржуазныя арміі, была аплотам закабалення і прыгнечання народаў, насяляўшых царскую Расію.

Наша Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія, разграміўшы Калчака і Дзенікіна, Юдзеніча, Врангеля і іншых ворагаў працоўных, разбіўшы і выгнаўшы ў тры шыі з межаў нашай краіны замежных інтэрвентаў і іх агентуру — буржуазна-нацыяналістычныя ўрады, вызваляла прыгнечаныя народы і забяспечвала іх палітычную і эканамічную свабоду і незалежнасць. І таму яна была і ёсць блізкай і роднай вызваленым народам Совецкага Саюза.

З першых дзён свайго існавання Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот будаваліся і выхоўваліся ў духу сапраўднага інтэрнацыяналізма. Інакш і не магло быць. Дзецішча большэвіцкай партыі, яны цалкам успрынялі вялікія ідэі Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна. Гэта рабіла і робіць чырвонаармейцаў і чырвонафлотцаў, нашых камандзіраў і начальніцкі састаў свядомымі барацьбітамі за соцыялізм, за справу вызвалення працоўных усяго свету ад капіталістычнага рабства.

Чырвонаармейцу і чырвонафлотцу, усяму асабоваму саставу арміі і флота чужды пачуцці расавай і нацыянальнай непрыязні, чаго не можа сказаць аб сабе ні адна армія капіталістычных дзяржаў. Наадварот, асновай духоўнага і маральнага выхавання салдат любой капіталістычнай арміі з'яўляецца шавінізм, прывіццё салдату нацыянальнай і расавай ненавісці і варожасці да людзей не яго нацыі або расы.

Чырвонаармеец і чырвонафлотец, як і ўсякі совецкі грамадзянін, паважае

(ПРАЦЯГ НА 2 СТАР.).

XX ГОД РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТА

Прамова народнага камісара абароны маршала Савецкага Саюза таварыша К. Е. ВАРАШЫЛАВА

на ўрачыстым пасяджэнні Маскоўскага совета Рабоча-Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў з удзелам грамадскіх арганізацый і вайсковых часцей, прысвечаным 20-годдзю Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота

ПРАЦЯГ

працоўных усіх нацый і рас, адносіцца да іх, як да братоў па працы, па класу. Іменна таму нашы байцы, Чырвоная Армія і Чырвоны Флот карысталіся і карыстаюцца ў працоўных усяго свету нязменнай любоўю.

Крыніца сілы Чырвонай Арміі і Чырвонага Флота заключаецца, нарэшце, у тым, што іх стварыла, сваёй крывёю заўсёды змацоўвала наша партыя, што іх пеставалі, імі кіравалі таварышы Ленін і Сталін. **(Працяжныя апладысменты).**

Усе бліскучыя перамогі ў грамадзянскай вайне, усё жыццё і дзейнасць Чырвонай Арміі і Флота нераздрыўна звязаны з нашай партыяй. Ваенныя советы франтоў і армій, партыйныя арганізацыі, ваенныя камісары і палітычныя аддзелы ў часцях — гэтыя органы комуністычнай партыі былі і астаюцца тым цудоўным цэментам, які змацоўваў і змацоўвае ўвесь асабовы састаў арміі ў адзіны, маналітны, адданы большэвіцкай партыі і совецкаму ўраду баявы калектыў.

Ваенны камісар, яго арганізатарская і палітыка-маральная роля ў дзейнічаючай арміі былі выключна вялікі.

«Без ваенкома мы не мелі-б Чырвонай Арміі», — гаварыў В. І. Ленін.

(Ленін, т. XXV, стар. 302).

Роля камісара ў даны час узрастае ў сувязі з новымі задачамі, якія стаяць перад Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміяй.

«Ваенкомы павінны быць душой ваеннай справы», — гаворыць таварыш Сталін.*).

Гэта ўскладае на ваеннага камісара надзвычай вялікую адказнасць і патрабуе ад яго напружанай большэвіцкай работы ва ўсіх галінах ваеннай справы.

Ваенны камісар абавязан ва ўсё ўваходзіць і абавязкова вывучаць і ведаць даручаную яму справу. Без сапраўдных палітработнікаў і ваенных камісараў у нас не можа быць той Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, якая нам патрэбна для барацьбы і перамог над капіталістычнымі, фашысцкімі арміямі ў выпадку іх нападу на совецкую краіну.

І ў годы грамадзянскай вайны і ў перыяд мірнага будаўніцтва партыя Леніна — Сталіна, яе лепшыя людзі, настаўленыя на розныя пасты ў радах Чырвонай Арміі, забяспечвалі ёй боездольнасць, поспехі і паступальны рух.

Велізарна і рознастайна роля ў барацьбе і будаўніцтве Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Чырвонага Флота выдатных пролетарскіх рэвалюцыянераў, верных сыноў партыі Леніна — Сталіна, незабыўнай памяці нашых друзей — Фрунзе, Дзержынскага, Кірава, Куйбышэва і Орджанікідзе. Справы і подвігі гэтых выпрабаваных барацьбітоў і будаўнікоў нашай вялікай социялістычнай дзяржавы і яе ўзброеных сіл будуць служыць прыкладам для жывучых і будучых пакаленняў. Памяць аб іх для ўсіх працоўных свяшчэнна!

У гады грамадзянскай вайны наша партыя ператварыла большую частку сваіх радоў у ваенных арганізатараў і байцоў. Яна растлумачвала чырвонаармейскім і чырвонафлоцкім масам мэты і задачы ўзброенай барацьбы, згуртоўвала іх вакол зразумелых і дарагіх ім лозунгаў і паказвала прыклады сапраўднага гераізма ў барацьбе за іх ажыццяўленне.

Па далёка няпоўных даных да лютага 1919 года, гэта значыць праз год пасля выдання ленінскіх дэкрэтаў аб арганізацыі ўзброеных сіл краіны, у Чырвонай Арміі і Флоце было ўжо 1.500 партыйных ячэек.

У жніўні 1919 года лік комуністаў дзейнічаючай арміі перавышаў 120.000 чалавек. У «партыйны тыдзень», які адбываўся ў Чырвонай Арміі і Флоце ў кастрычніку—снежні 1919 года, у комуністычную партыю ўступіла да 25 проц. усёй Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

Калі прыняць пад увагу, таварышы, ваенна-палітычнае становішча совецкай рэспублікі таго часу, калі вогненае кальцо контррэволюцыі і замежнай інтэрвенцыі, бесперапынна сціскаючыся, пагражала самаму сэрцу пролетарскай рэволюцыі — Маскве, калі бядоты вайны дасягнулі свайго кульмінацыйнага пункту, калі голад, тыф і іншыя жахі гулялі па совецкай зямлі, стане зразумелым, якім бязмежным давер'ем і любоўю карысталася наша партыя ў байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі і Чырвонага Флота. Фактам свайго ўступлення ў рады нашай партыі вялізная маса байцоў падкрэслівала сваю бязмежную адданасць справе пролетарскай рэволюцыі, сваю поўную гатоўнасць змагацца ў радах партыі за ўладу советаў, за справу социялізма да канца, да поўнай перамогі над капіталістамі і памешчыкамі, кулакамі і інтэрвентамі.

К пачатку 1920 года ў Чырвонай Арміі і Флоце ўжо налічвалася каля 300.000 комуністаў і кандыдатаў, гэта значыць большая палова ўсёй нашай партыі. Гэты трохсоттысячны масіў комуністаў, кіруемы Леніным і Сталіным, і быў, у канчатковым выніку, той арганізуючай і накіроўваючай сілай, якая стварыла магутнасць і несакрушальнасць Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота і прадвызначыла канчатковую нашу перамогу.

Вялікі Ленін з выключнай увагай і з асаблівымі клопатамі адносіўся да ўсяго, што датычыла арганізацыі ўзброеных сіл пролетарскай дыктатуры. Пад яго асабістым кіраўніцтвам вырашаліся ўсе важнейшыя пытанні арганізацыі і камплектавання, палітработы, снабжэння і баявой дзейнасці Чырвонай Арміі. Ленін часта асабіста даваў канкрэтныя ўказанні па рознастайнейшых пытаннях мабілізацыі, арганізацыі рэволюцыйнай актыўнасці мас для забеспячэння перамогі. Ён няўхільна і ўважліва сачыў за тым, каб франты задавальняліся па магчымасці ўсім неабходным. Ён знаходзіўся ў бесперапыннай дзелавой, заўсёды актуальнай перапісцы з многімі палітработнікамі, камандзірамі, установамі арміі і флота. Ён хацеў усё ведаць, што робіцца на франтах, у арміях, у асобных часцях. Ён ва ўсё ўнікаў.

Аднак, сачыць, уздзейнічаць на баявыя франты ён мог толькі праз сваіх верных, адданых справе і яму, нашаму Леніну, людзей. **Бліжэйшым саратнікам і пастаянным ваенным саветнікам Леніна быў таварыш Сталін. (Бурныя апладысменты).**

На працягу трох год грамадзянскай вайны таварышу Сталіну прыйшлося падоўгу працаваць на розных баявых франтах. Не было амаль ні аднаго баявога ўчастка, дзе-б не пабываў ці не працаваў таварыш Сталін. А там, дзе ваеннае становішча рабілася цяжкім, крызісным, ён з'яўляўся, як правіла, абавязкова. Ленін вельмі добра ведаў, што толькі Сталіну пад сілу справіцца з задачамі, якія ўзнікалі ў сувязі з небяспекай, а іншы раз і з пагражаўшай катастрофай на фронце. І Ленін у гэтым ні разу не памыліўся. **(Працяглыя апладысменты).**

Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот перамагалі, былі і астаюцца моцнымі таму, што яны, апрача баявой тэхнікі, узброены яшчэ вялікімі ідэямі Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна, што кожны крок іх дзейнасці быў пранізан уплывам нашай партыі, што імі ў грамадзянскай вайне кіравалі вялікія стратэгі пролетарскай рэволюцыі Ленін і Сталін. **(Апладысменты).**

РСЧА расла і мацнела разам з ростам усёй краіны

Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот на працягу ўсіх 20 год будаваліся і ўдасканальваліся пад кіраўніцтвам партыі і ўрада, пад пільным і непасрэдным наглядам нашага Сталіна і к цяперашняму часу з'яўляюцца цалкам сучаснымі, тэхнічна добра аснашчонымі ўзброенымі сіламі, дастойнымі тых гістарычных задач, якія ўскладзены на іх нашай партыяй і рабоча-сялянскім урадам. **(Апладысменты).**

Велізарныя дасягненні ў будаўніцтве ўзброеных сіл нашай краіны за 20 год мы маем таму, што ў самым социялістычным ладзе закладзены неабмежаваныя магчымасці росквіту ўсіх вытворчых сіл совецкай дзяржавы; таму, што сама социялістычная дзяржава за 20 год вырасла ў магутную, культурную, бесперапынна квітнеючую социялістычную дзяржаву.

За дзве сталінскія пяцігодкі ў жыцці нашай краіны многае і карэнным чынам змянілася.

Гэтыя гады былі гадамі бурнага росту нашай социялістычнай індустрыі і калгаснай сельскай гаспадаркі. За гэтыя гады арганізавана занава або атрымалі велізарнае развіццё цэлы рад важнейшых галін прамысловасці.

Усё гэта непасрэдна і прама адлюстравалася на аснашчэнні і ўзбраенні арміі і флота; усё гэта прадаўжае служыць надзейнай і трывалай базай бесперапыннага росту і ўдасканальвання нашых узброеных сіл.

Таварышы! Мы ўсе добра ведаем, што такое сучасныя арміі буржуазных, імперыялістычных краін.

Гэта перш за ўсё баявыя машыны самых рознастайных канструкцый і баявога прызначэння. Яшчэ не так даўно асобныя буржуазныя ваенныя спецыялісты — апалагеты танкаў і авіяцыі — так захапляліся машынай, што ўгледзелі ў ёй панацэю ад усіх бед, нават ад немінучых надыходзячых рэволюцый. Яны бачылі ў баявых машынах пазбаўленне ад неабходнасці мець шматмільённыя арміі, якія, як цяпер ужо добра вядома, не заўсёды паслухмяны і пакорны; марылі аб малых машынізаваных арміях, укамплектаваных надзейным, верным пануючаму буржуазнаму ладу асабовым саставам. Апрача пісання і разгавораў, аднак, нічога з гэтага не вышла. Цяпер прызнана і праводзіцца ў жыццё ўсімі ўрадамі і генеральнымі штабамі капіталістычных краін правіла: больш баявых машын і сучаснай зброі, але абавязкова і самая большая армія, якую толькі ў сілах мець даная буржуазная дзяржава. Паглядзім, як толькі пры гэтым будзе вырашацца імперыялістамі пытанне наконт небяспекі магчымых «непрыемных непаразуменняў» (чытай рэволюцый), немінуча звязаных з вялікімі мабілізаванымі арміямі, але гэта ўжо іх справа.

Імперыялістычная буржуазія, асабліва фашысцкая яе частка, у пытаннях узбраенняў, можна сказаць, закусіла вудзіла. Зараз ужо не гонка паміж буржуазнымі дзяржавамі ў справе ўзбраенняў, а ўзнікла і дзейнічае нейкая дзікая скачка. Трацяцца шалёныя сродкі на ўзбраенні, і ўсё-ж усё не перастаюць крычаць: мала, мала, давай больш!

У шалёным ажыятажы ўзбраенняў буржуазія арганізоўвае сусветную бойню, якая гатова разразіцца ў любы момант. Арганізаваны і раздуты фашысцкімі краінамі — на захадзе і ўсходзе — ваенны пажар пагражае распаўсюдзіцца і ахапіць увесь свет.

Пад пастаяннай пагрозай нападу знаходзіцца наша совецкая краіна. Яе баяцца, яе больш за ўсё ненавідзяць імперыялісты, яна папярок горла стала фашысцкім правадырам і заправілам. Яны гатовы ўтапіць нас у лыжцы вады.

Наша армія і флот, таварышы, існуюць не для агрэсіі. Цяпер гэта вядома і малому дзіцяці. Яны не збіраюцца нападаць на каго-б там ні было. Але зорка сачыць, пільна наглядаць за адбываючыміся падзеямі, быць гатовымі кожны міг знішчыць ворага, не дапусціўшы яго перайсці нашы граніцы, гэта іх прамы і свяшчэнны абавязак. Армія і флот заклікаены абараняць сваю совецкую, социялістычную дзяржаву. Але яны, на жаль, не могуць перашкодзіць любой буржуазнай арміі ці групе іх напасці на нашу радзіму іншым шляхам, як толькі процівапаставіць ім сваю магутнасць і сілу. Вось чаму наша армія і Ваенна-Марскі Флот не могуць, не маюць права быць горш, слабей, у якіх бы та ні было адносінах, армій і флотаў сваіх капіталістычных суседзяў.

Нашы ўзброеныя сілы прыведзены ў належны баявы парадак, яны машынізаваны не горш, чым у любой капіталістычнай краіне. Мы ведаем, што партыя і ўрад, наш мудры Сталін будуць і надалей рабіць усё, каб нашы армія і флот бесперапынна атрымлівалі высокую баявую тэхніку, а, значыць, каб узброеныя сілы социялізма былі самымі магутнымі, самымі машынізаванымі і таму ніколі, нідзе і нікім неперажнымі. **(Працяглыя апладысменты).**

Сухапутныя сілы

Нашы стралковыя войскі маюць у поўнай меры сучаснае і ў патрэбнай колькасці ўзбраенне.

Аснашчанасць баявой тэхнікай і ўзбраеннем нашай стралковай дывізіі к данаму часу стаіць на належным узроўні і не ўступае дывізіям самых перадавых капіталістычных краін.

Пяхотныя войскі Чырвонай Арміі заслугоўваюць таго, каб імі ганарылася ўся совецкая краіна.

Колькі-б мы ні мелі танкаў, авіяцыі і іншых навейшых сродкаў барацьбы, пяхота пакуль што астаецца асноўным родам войск. Без пяхоты ні танкі, ні авіяцыя, ні конніца вырашыць поўнасцю задач баёў і вайны не могуць.

Нашы скромныя, але выдатныя стралкі і камандзіры і на манеўрах, і пры ахове совецкіх граніц паказваюць узоры баявой вывучкі, самаадданасці, вынослівасці, рухомасці, стойкасці і высокай баявой гатоўнасці. Мы ведаем, што геройчныя стралковыя войскі, не гледзячы на дрэннае ўзбраенне і аснашчэнне, былі галоўнай і пераможнай сілай у грамадзянскай вайне. Яны і надалей астануцца грознай сілай для ворага, надзейным вартавым совецкай рэспублікі.

Артылерыя

Артылерыя, не гледзячы на наяўнасць новых сур'ёзных баявых сродкаў падаўлення, як танкі і авіяцыя, астаецца адным з важнейшых родаў войск у сучаснай вайне. Гэта палажэнне поўнасцю пацвярджаецца іспанскай і японa-кітайскай войнамі, дзе артылерыя, судзячы па даных прэсы, займае адно з галоўных месц у баявых аперацыях.

Таму намі, побач з развіццём новых родаў войск, артылерыі заўсёды аддавалася і аддаецца асабліва вялікая ўвага. Дастаткова сказаць, што гэтай справай непасрэдна і ўшчыльную займаецца сам таварыш Сталін. **(Бурныя апладысменты).**

Асабовы састаў нашай артылерыі цалкам падрыхтаван і добра ведае сваю справу. Быць добрым артылерыстам, асабліва артылерыйскім камандзірам, азначае быць усебакова адукаваным чалавекам.

Бадай, ні адзін род зброі не патрабуе ад камандзіра і байца такой дысцыпліны, розуму, волі і ведаў, як артылерыя. Рабоча-сялянскія камандзіры і байцы чырвонай артылерыі не складаючы рук працуюць над сваім удасканаленнем і дабіваюцца нядрэнных рэзультатаў. Наша артылерыя расце, удасканальваецца і знаходзіцца на вышыні вялікіх, баявых задач, якія стаяць перад ёю.

Конніца

Конніца ва ўсіх арміях свету перажывае, вярней перажыла ўжо, крызіс і ў многіх арміях амаль што зышла на нішто. Вопыт сусветнай, пазіцыйнай вайны і асабліва пасляваеннае развіццё авіяцыі, танкаў і насычэнне сучасных баявых франтоў артылерыйскім і кулямётным агнём — усё гэта, разам узятае, прывяло генеральныя штабы многіх капіталістычных краін да пераканання, што конніца ў будучай вайне не знойдзе свайго месца.

Мы стаім на іншым пункце гледжання. Зразумела, умовы для дзеянняў конніцы ў будучых войнах будуць рэзка адрозніваецца ў параўнанні з тым, што было раней, і ранейшая гордая назва царыцы палёў зараз не зусім да яе падыйдзе. Гэта ўсё бясспрэчна, асабліва для заходніх краін. Аднак, мы пераканаваны, што наша доблесная конніца яшчэ не раз прымусіць аб сабе гаварыць, як аб магутнай і пераможнай чырвонай кавалерыі. Наша конніца поўнасцю і адпаведна сучасным умовам рэарганізавана. Яна не без абароннa супроць авіяцыі і танкаў і пабудавана так, што і ва ўзаемадзеянні з іншымі родамі войск і самастойна можа вырашаць сур'ёзныя баявыя задачы. Нашы граніцы, таварышы, неабсяжны, і ворагаў у совецкай дзяржавы нямала. Чырвонай конніцы, яе доблесным байцам і камандзірам таму будзе дзе прыкласці свае намаганні і справай даказаць, што чырвоная кавалерыя па-ранейшаму з'яўляецца пераможнай і сакрушальнай узброенай сілай і можа і будзе вырашаць вялікія задачы на ўсіх баявых франтах. **(Апладысменты).**

Механізаваныя войскі і танкавыя часці

Мотамеханізаваныя і танкавыя часці мы будуем выходзячы з вопыту імперыялістычнай вайны і ўліку вопыту войнаў Іспаніі і Кітая. Мы ўлічваем таксама і своеасаблівасць і асаблівасці нашых граніц, прымаем пад увагу такcама змены ў арганізацыі іншых родаў войск.

К данаму моманту мы маем досыць добрыя ў колькасных і якасных адносінах мотамеханізаваныя і танкавыя войскі.

Асабовы састаў гэтых войск у адносінах ведання сваёй тэхнікі і вынослівасці на ўсіх вучэннях і манеўрах нязменна паказвае сябе дастойным валоданні ім гэтай магутнай зброі. Доблесныя танкісты ўладаюць сваімі танкамі выдатна, нярэдка прама мастацка, ведаюць і любяць сваю справу. Танкавыя войскі будуць адыгрываць на вайне, як гэта мае месца ў Іспаніі і Кітаі ўжо зараз, вялікую і сур'ёзную ролю.

Я магу вас запэўніць, таварышы, што танкавыя войскі Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі заўсёды ў поўнай гатоўнасці выступяць на абарону сваіх граніц, кінуцца на ўзброеныя сілы напаўшага на нашу радзіму ворага. **(Апладысменты).**

Хімічныя часці

Яны маюць абарончае значэнне. Як вядома, у 1925 годзе мы ў Жэневе падпісалі пратакол, які забараняе выкарыстоўванне хімічнай і бактэрыялагічнай зброі на вайне. Совецкая дзяржава ўзятыя на сябе міжнародныя абавязацельствы выконвае няўхільна. На жаль, па-іншаму глядзяць на такога роду акты некаторыя іншыя дзяржавы і ўрады. Асабліва небяспечны погляд на гэты прадмет у фашысцкіх дзяржаў. Вось чаму і нам прыходзіцца праграму абучэння хімічных войск дапаўняць раздзеламі, якія выходзяць за рамкі падрыхтоўкі часцей толькі да абароны ад хімічнага нападу. Мы не хочам, не маем права быць заспігнутымі знянацку.

Хімічныя часці ідуць нага ў нагу з іншымі родамі войск і працуюць многа і нядрэнна і, калі агрэсіўнаму ворагу ўздумаецца калі-небудзь пакрапіць нашы войскі хімічнымі сродкамі, ён атрымае ў адказ тую-ж страшную хімію на сваю ўласную галаву. **(Бурныя апладысменты).**

Ваенна-паветраныя сілы

Партыя, урад і асабліва асабіста таварыш Сталін заўсёды аддавалі і нязменна аддаюць вялікую ўвагу развіццю ваенна-паветраных сіл. Авіяцыйным часцям у будучых войнах адводзіцца, як вядома, сур'ёзная рознабаковая, у тым ліку і вялікая самастойная роля. На іх будуць ускладзены задачы не толькі камбінаваных ва ўзаемадзеянні з іншым родамі войск удараў, ім будзе прадастаўлена рашэнне і самастойных стратэгічных задач. Ужо цяпер Франко ў Іспаніі, японцы ў Кітаі скарыстоўваюць свае авіясілы не толькі як дапаможныя сродкі, але прабуюць рашаць і вялікія аператыўныя задачы.

Сучасная авіяцыя пры яе вялікім радыусе дзеянняў становіцца сродкам, з дапамогаю якога любы агрэсар можа ажыццявіць напад на іншую дзяржаву, калі яму ўздумаецца, нават не маючы з ёю агульных граніц.

Совецкі Саюз мае граніцы з многімі капіталістычнымі краінамі. Мы павінны быць заўсёды і як належыць на-пагатове. Мы абавязаны ўважліва прыглядацца і сачыць за развіццём авіяцыі за граніцай. У гонцы ўзбраенняў паміж буржуазнымі краінамі самая шалёная гонка адбываецца ў галіне будаўніцтва авіяцыі. Буржуазныя краіны, асабліва фашысцкія, не шкадуюць ні сродкаў, ні намаганняў, каб бесперапынна павялічваць свае і без таго ўжо велізарныя авіяцыйныя сілы, каб быць мацней адна другой. Само сабой зразумела, таварышы, мы ні ў якіх спаборніцтвах і гонках не ўдзельнічаем. Аднак, мы не астаемся сляпымі і глухімі да адбываючагася за рубяжом. Мы робім усё, каб ваенна-паветраны флот Совецкага Саюза быў на вышыні, на якой ён абавязан быць. Я павінен сказаць, што паветраныя сілы не адстаюць ад іншых нашых, больш старых родаў войск, а ў тым-сім іх апярэджваюць. Гэта справа таксама знаходзіцца пад асабістым і няўхільным кіраўніцтвам таварыша Сталіна. **(Апладысменты).**

Нашы выдатныя лётчыкі—гордасць совецкага народа—на совецкіх самалётах не раз паказалі сябе сапраўднымі героямі. Нашы лётчыкі ўладаюць поўнасцю, па-сапраўднаму тэхнікай авіяцыйнай справы; яны ведаюць і любяць яе, як належыць ведаць і любіць сваю справу ўсякаму чэснаму партыйнаму і непартыйнаму большэвіку, усякаму чэснаму байцу РСЧА.

Совецкія лётчыкі, моцныя духам, з непахіснай сталінскай воляй, справай даказваюць, на што яны здольны. Лётчыкі-героі Совецкага Саюза становяцца прызнанымі героямі і за межамі нашай радзімы. Яны — пераможцы неприступных паветраных прастораў — увасабляюць сабой духоўную сілу, спакой і непахісную волю совецкага народа і баявую магутнасць нашай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. **(Працяглыя апладысменты).**

Іншыя роды войск

У складзе РСЧА і Ваенна-Марскога Флота, побач з асноўнымі родамі войск, ёсць войскі дапаможнага назначэння, войскі — сувязі, інжынерныя, хімічныя, процівапаветранай абароны і інш. Аб іх мала гавораць, яны скромны, але гэта не менш патрэбныя, а галоўнае — не менш добрыя, чым любыя іншыя войскі. Людзі і тут, як правіла, дасканалыя, шмат працуючыя і ведаючыя сваю справу.

Марскі флот

Капіталістычныя краіны, побач з узмацненнем сваіх сухапутных і паветраных сіл, прадаўжаюць фарсавана і ўзмоцнена ўзбройвацца на моры.

Наша краіна на дзесяткі тысяч кілометраў амываецца марамі і акіянамі. Ахоўваць совецкія берагі справа не лёгкая. Таму партыя і ўрад аддаюць нашаму ваенна-марскому флоту і берагавой абароне асабліва сур'ёзную ўвагу.

У даны час Ваенна-Марскі Флот прадстаўляе велічыню сур'ёзнага значэння. Ён ужо настолькі моцны, каб надзейна ахоўваць усе нашы блізкія і далёкія марскія граніцы. Воляю партыі і совецкага ўрада, пад непасрэдным наглядам і кантролем таварыша Сталіна, прыняты меры да таго, каб наш Ваенна-Марскі Флот у бліжэйшыя гады вырас, стаў ва ўзровень тых задач, якія стаяць перад краінай па абароне сваіх марскіх граніц.

У мэтах далейшага развіцця марскога флота партыя і ўрад прызналі неабходным выдзяленне ваенна-марскіх сіл у самастойны агульнасаюзны Народны Камісарыят Ваенна-Марскога Флота.

Ваенна-Марскі Флот, яго выдатныя кадры — чырвонафлотцы, камандзіры і палітработнікі заўсёды прадстаўлялі сабой лепшую баявую часць узброеных сіл Совецкага Саюза. Цяпер-жа, калі Ваенна-Марскі Флот стаў самастойным Народным Камісарыятам, яго выдатныя людзі зробяць ўсё, а стала быць тое, што трэба, каб у невялікія тэрміны дабіцца вялікіх рэзультатаў па будаўніцтву магутнейшага Чырвонага Ваенна-Марскога Флота. **(Апладысменты).**

Мы вельмі добра ведаем асабовы састаў марскіх сіл, ведаем яго ўпартасць, баявую загартоўку, беззаветную адданасць справе социялізма, справе партыі Леніна — Сталіна і мы пераканаваны ў паспяховым вырашэнні Народным Камісарыятам Ваенна-Марскога Флота, на чале з Пятром Александравічам Смірновым, усіх пастаўленых перад ім задач. **(Апладысменты).**

***

Таварышы! Уся наша социялістычная індустрыя і Народны Камісарыят абароннай прамысловасці ў першую галаву прарабілі і прадаўжаюць весці гіганцкую работу па аснашчэнню і ўзбраенню сваіх Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

На падставе перамог двух сталінскіх пяцігодак зроблена карэнная тэхнічная рэканструкцыя нашых узброеных сіл. Социялістычныя фабрыкі і заводы далі і даюць Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскому Флоту сучасную баявую тэхніку ўсіх найменаванняў і назначэння.

Сёння, у дзень свайго юбілея, Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот прыносяць сваю чырвонаармейскую падзяку ўсім стаханаўцам, рабочым, інжынерам, тэхнікам і кіраўнікам, асабліва ваеннай прамысловасці, так многа і бліскуча папрацаваўшым для стварэння баявой магутнасці ўзброеных сіл Совецкага Саюза. **(Апладысменты).** Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот абяцаюць умела ўладаць усёй атрымліваемай імі зброяй і калі вораг прымусіць прымяніць яе на справе — узяць з яе ўсю яе знішчальную здольнасць. **(Апладысменты).**

(ПРАЦЯГ НА 3-й СТАР.).



«Чапаеў». Карціна мастака А. Заборава. Фота І. Каплінская.

*) Тэзісы для прапагандыстаў да 20-годдзя РСЧА і Ваенна-Марскога Флота, «Праўда» ад 16/II-1938 г.

XX ГОД РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТА

Прамова народнага камісара абароны маршала Совецкага Саюза таварыша К. Е. ВАРАШЫЛАВА

на ўрачыстым пасяджэнні Маскоўскага совета Рабоча-Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў з удзелам грамадскіх арганізацый і вайсковых часцей, прысвечаным 20-годдзю Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота

ПРАЦЯГ

Чырвонаармейцы, чырвонафлотцы, камандзіры і начальнікі

Таварышы! Сіла і баявая магутнасць Чырвонай Арміі і Чырвонага Флота заключаюцца не толькі і нават не столькі ва ўзбраенні і спецыяльнай тэхніцы, колькі ў совецкіх людзях, кадрах арміі — камандным, начальніцкім і палітычным складзе і радавых байцах.

«Кадры рашаюць усё» — гаворыць таварыш Сталін. І калі гэта няўхільная ісціна наогул, то ў прымяненні да ўзброеных сіл нашай краіны гэта ісціна памнажаецца на спецыфіку ролі і значэння людзей, кадраў у вайне.

Што-ж сабой прадстаўляюць кадры нашых узброеных сіл у даны час? Я думаю, што мне няма патрэбы даказваць, што байцы, камандзіры і палітработнікі Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота — гэта лепшыя сыны свайго народа, людзі, якія душой, усім жыццём адданы сваёй вялікай радзіме, людзі, якія напружана і не без поспеху працуюць над сабой, каб поўнасцю авалодаць даручанай ім справай і быць сапраўднымі барацьбітамі за вялікую справу соцыялізма, быць заўсёды і як належыць гатовымі абараняць сваю радзіму

Адной з асноўных труднасцей у першыя годы будаўніцтва ўзброеных сіл было стварэнне сваіх, падрыхтаваных у ваенных адносінах, камандных і начальніцкіх кадраў.

Камандныя пасады ў годы грамадзянскай вайны замяшчаліся салдатамі, унтэр-афіцэрамі, афіцэрамі старой арміі, а часта і проста перадавымі рабочымі і сялянамі, хоць і не маючымі ніякай ваеннай падрыхтоўкі Але з таго часу шмат вады ўцякло, і былыя царскія салдаты, унтэры, калісьці простыя рабочыя і сяляне, ператварыліся ў адукаваных, ведаючых ваенную справу, чырвоных камандзіраў і начальнікаў.

Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот у сучасны момант распалагаюць 12 спецыяльнымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, якія выпускаюць штогод не адну тысячу камандзіраў, інжынераў, урачоў і інш. спецыялістаў ваеннай справы.

Ваенныя вучылішчы за апошнія 10 год даюць арміі і флоту штогод дзесяткі тысяч камандзіраў і тэхнікаў.

Адным з найбольш істотных дасягненняў у справе фармавання камандных кадраў мы лічым стварэнне патрэбнага кадра моцных, ведаючых, палітычна пісьменных малодшых камандзіраў. Наш малодшы камандзір гэта не толькі бліжэйшы для чырвонаармейца клапатлівы начальнік. Гэта яго пастаянны таварыш, настаўнік і друг у баявой вучобе і рабоце. Малодшы камандзір на вайне будзе адыгрываць выключна вялікую і надзвычай важную ролю. Гэтыя кадры мы ўсяляк расцім і ўдасканальваем Многія сотні і тысячы з іх атрымліваюць патрэбную падрыхтоўку і становяцца лейтэнантамі.

Баец Чырвонай Арміі і Флота быў заўсёды, а за апошнія годы стаў у асаблівасці ведаючым сваю справу воінам, дысцыплінаваным салдатам рэволюцыі, адданым сваёй радзіме і справе соцыялізма. Не баючыся ўпасці ў перапавелічэнне, прама скажу — лепшых людзей, чым нашы чырвонаармейцы і чырвонафлотцы, цяжка выдумаць.

Наш камандзір усіх ступеняў і рангаў і чырвонаармеец і чырвонафлоцец — гэта браты па класу. Іх інтарэсы адзіны, яны служаць адной вялікай справе соцыялізма, аднолькава змагаюцца за свой народ, за сваю вялікую Совецкую Радзіму. Яны прадстаўляюць адну згуртаваную брацкую сям'ю.

Людзі Чырвонай Арміі — гэта перадавыя людзі нашай краіны.

Салдат буржуазнай арміі выкрэсліваецца з жыцця працоўнага калектыва. Буржуазныя законы накіраваны да таго, каб засцерагчы армію ад пабочнага ўздзеяння. Армія па-за палітыкай — гаворыць хлуслівы дэвіз буржуазіі.

Па-за палітыкай толькі салдацкая маса, яна пазбаўлена і грамадзянскіх правоў і якога-небудзь уплыву на дзяржаўнае жыццё, але затое яна—паслухмяная зброя ў руках правячай буржуазіі і вернага ёй начальства

Наша армія і флот жывуць поўным жыццём сваёй краіны. У першым совецкім парламенце — Вярхоўным Совеце СССР — 86 чалавек дэпутатаў ад Чырвонай Арміі і Чырвонага Флота. Разам з іншымі прадстаўнікамі працоўных яны заклікаваны рашаць лёс Совецкай дзяржавы, кіраваць шматмільённай совецкай краінай

Байцы і камандзіры, знаходзячыся ў Чырвонай Арміі і Флоце, не перастаюць быць барацьбітамі і будаўнікамі свайго жыцця. Больш таго У Чырвонай Арміі людзі развіваюць і ўмацоўваюць тыя рысы, якія ўласцівы новаму соцыялістычнаму чалавеку. Малады рабочы, селянін або служачы за годы ваеннай службы змяняецца да непазнавальнасці. Да моманту ўходу яго з радоў Чырвонай Арміі і Флота ён становіцца ўжо палітычна зрэлым чалавекам, з патрэбным запасам ведаў, з культурным кругагорам, адданым справе комунізма, справе сваёй соцыялістычнай радзімы. Ён ідзе ў запас арміі дысцыплінаваным тружанікам, будаўніком сваёй соцыялістычнай Радзімы і свайго чалавечага шчасця.

Чырвоная Армія і Чырвоны Флот з'яўляюцца школай соцыялістычнай культуры і соцыялістычнай асветы.

Яны распалагаюць багацейшай сеткай самых разнастайных культурнаасветных устаноў, забяспечваюць магчымасць байцу і камандзіру беспераПынна развівацца. Дамы Чырвонай Арміі і Флота, клубы і бібліятэкі — гэта, па сутнасці справы, своеасаблівыя чырвонаармейскія і чырвонафлоцкія універсітэты, дзе разгорнуты рознабаковыя віды вучобы — ваеннай, палітычнай і агульнаадукацыйнай.

Мы з удзячнасцю адзначаем вялікую і каштоўную дапамогу ў гэтай справе Чырвонай Арміі і Флоту людзей навукі і мастацтва — шэфаў РСЧА і Флота — сваімі лекцыямі, дакладамі і паказам лепшых узораў совецкага мастацтва. **(Апладысменты).**

Байцы, увесь асабовы састаў РСЧА і Ваенна-Марскога Флота ведаюць, што толькі будучы культурнымі, палітычна свядомымі яны могуць забяспечыць умелае і ўсебаковае скарыстанне тэхнічнай магутнасці краіны і арміі для



С. М. БУДЗЕННЫ, М. В ФРУНЗЕ, К. Е. ВАРАШЫЛАЎ у часе грамадзянскай вайны. Саюзфото.

хутчэйшай перамогі ў прадстаячых бітвах з імперыялістамі, фашыстамі за сваю Радзіму, за соцыялізм.

Людзі Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота — стойкія і надзейныя абаронцы нашай Радзімы. Яны ўпарта працуюць над умацаваннем боездольнасці і магутнасці ўзброеных сіл сваёй краіны. Не адна тысяча з іх адзначана Совецкім Урадам вышэйшымі дзяржаўнымі ўзнагародамі.

У радах Чырвонай Арміі 55 Герояў Совецкага Саюза. **(Апладысменты).** А быць героем сярод нашага гераічнага народа — гэта лёс самых перадавых з многіх тысяч лепшых людзей Совецкага Саюза.

Крыніцай гераізма, храбрасці, смеласці і адвагі байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі і Флота з'яўляецца іх адданасць справе нашай Комуністычнай Партыі, іх бязмежная любоў да сваёй Радзімы, да свайго народа і вялікага Сталіна.

Кадры ўзброеных сіл Саюза ССР моцны сваёй большэвіцкай ідэйнасцю і соцыялістычным сазнаннем. Гэтым соцыялістычным сазнаннем і разуменнем рэволюцыйных задач Чырвоную Армію ўзбройвае наша большэвіцкая партыя і яе армейская арганізацыя.

В. І. Ленін і таварыш Сталін не раз указвалі, што перамогі Чырвонай Арміі на франтах грамадзянскай вайны былі магчымымі дзякуючы самаадданасці армейскіх комуністаў і той рабоце па соцыялістычнай асвеце і арганізацыі мас, якую партыйныя арганізацыі, паліторганы і ваенныя камісары праводзілі сярод чырвонаармейцаў і камандзіраў.

Наша армейская партыйная арганізацыя прадстаўляе сабой у даны час шматлікі, моцна згуртаваны і адданы справе Леніна—Сталіна баявы атрад нашай партыі. Ён з'яўляецца палітыкамаральным стрыжнем, арганізуючым жыццё, усю дзейнасць узброеных сіл.

Бліжэйшым памочнікам армейскай партарганізацыі ў яе вялікай і рознабаковай рабоце з'яўляецца Ленінскі Комсамол, які налічвае ў Арміі да поўмільёна чалавек. **(Апладысменты).** Комсамольцы Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота — гэта выдатны. залаты фонд абароны дзяржавы працоўных. Яны ідуць нага ў нагу з партыйцамі, паказваюць выдатныя ўзоры ўпартасці ў дасягненні пастаўленых мэт, ва ўменні перамагаць усе і ўсякія труднасці, у трывалым асваенні даручанай ім справы, у беззаветнай адданасці большэвіцкай партыі і сваёй Соцыялістычнай Радзіме.

Усесаюзны Ленінскі Комсамол, шэфствуючы над Ваенна-Марскім Флотам і Паветранымі Сіламі, аказвае ім вялікую і ўсебаковую дапамогу ў справе выканання імі сваіх задач.

Ваенныя Советы акруг, флотаў, паліторганы і ваенныя камісары ў часцях і ўстановах Арміі і Флота вядуць вялікую і напружаную работу па палітычнаму абслугоўванню байцоў і камандзіраў, па кіраўніцтву партыйным і грамадскім жыццём узброеных сіл. Іх задачы і роля велізарны цяпер, ва ўмовах мірнага часу, яны ўзрастуць яшчэ ў большай ступені ў часе вайны.

Таварышы!

Мы акружаны з усіх бакоў капіталістычнымі краінамі,—аб гэтым неаднаразова гаварыў Ленін, аб гэтым нястомна гаворыць таварыш Сталін. Капіталістычныя краіны гэта — іншы, заўсёды і немінуча варожы свет нашай краіне, краіне соцыялізма, дзяржаве рабочых і сялян.

Таму нашы класавыя ворагі, у першую галаву і ў асаблівасці фашысты, вельмі добра разумеючы ролю кадраў Чырвонай Арміі і Флота ў справе абароны соцыялістычнай бацькаўшчыны, рабілі і будуць надалей рабіць усё, ні перад чым не спыняючыся, каб мець доступ у іх асяроддзе, мець у іх сваю агентуру, шпіёнаў, шкоднікаў і дыверсантаў.

Яно так і здарылася.

Фашысцкім і іншым правакатарам і разведчыкам удалося запусціць свае шчупальцы ў рады Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

На працягу раду год у Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскім Флоце, прытаіўшыся, арудавалі такія мацёрыя здраднікі Радзімы, шпіёны, як Тухачэўскі, Гамарнік, Якір, Убарэвіч, Орлоў, Корк, Лудры, Эйдэман, Сіўкоў і нямала іншых, не менш мацёрых і подлых здраднікаў.

Гэта ваенна-фашысцкая банда лоўка і старанна скрывала свае здрадніцкія справы. Яна арудавала цішком, здраджваючы і прадаючы сваю бацькаўшчыну, сваю Армію і Флот.

За здраду Радзіме, за здраду Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі ваенна-фашысцкія бандыты, здраднікі і шпіёны панеслі заслужаную кару. Яны змецены з твару зямлі, знішчаны. **(Працяглыя апладысменты).**

Чырвоная Армія пасля знішчэння ваенна-фашысцкай банды і ачышчэння сваіх радоў ад прадажнай, здрадніцкай мярзотнасці стала нязмерна больш моцнай, яшчэ больш чым калі-небудзь маналітнай і спаянай вакол партыі Леніна—Сталіна, вакол нашага Рабоча-Сялянскага Урада. **(Апладысменты).**

Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот былі і заўсёды будуць неад'емнай, саставной часткай свайго вялікага совецкага народа.

Усім, хто марыў праз здраднікаў і шпіёнаў, подла ашукаўшых народ і Армію, паслабіць магутнасць узброеных сіл Совецкага Саюза, зрабіць падкоп пад крэпасць нашай дзяржавы, мы скажам: — пралічыліся, паны! Ваша карта яшчэ раз і канчаткова біта! **(Бурныя апладысменты).**

А тых, чыя парочная душа здольна на здраду Радзіме, на якую-б та ні было здзелку з класавым ворагам, мы папярэджваем — здрада, прадажніцтва, шпіёнства і ўсё падобнае на гэтыя гнусныя злачынствы супроць народа, дзяржавы будуць заўсёды і абавязкова канчацца для іх ганебнай смерцю.

Таварышы!

Класавы вораг хітры, наглы і каварны — гэта ўсім добра вядома. Ён не склаў і ніколі не складзе сваёй атручанай зброі. Мы не маем таму права аддавацца благадушнасці, манілаўшчыне. Мы — ваенныя людзі — павінны і будзем у сто разоў больш пільнымі, аглядальнымі, уважлівымі да акружаючых, лепш будзем будаваць нашу работу і тым забяспечым яшчэ больш бурны рост усіх старон жыцця, будаўніцтва і ўдасканальвання нашых Рабоча-Сялянскай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

Камандзірам, начальнікам і ў асаблівасці паліторганам і камісарам трэба памятаць і ніколі не забываць, што толькі большэвіцкай пільнасцю ў спалучэнні з напружанай, разумнай, арганізаванай работай мы забяспечым сябе ад пранікнення ў наша асяроддзе замежных разведак, толькі гэтым шляхам засцярожым сябе ад гнусных спроб класавых ворагаў атручваць сваім ядам слабых духам. Паліторганы і камісары працуюць многа, але павінны працаваць яшчэ больш, яшчэ больш чотка, яшчэ лепш. Яны павінны і будуць працаваць па-сталінску. **(Апладысменты).**

Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот свае задачы выканаюць поўнасцю

Таварышы!

Совецкі Саюз акружаюць з усіх бакоў капіталістычныя дзяржавы. Совецкі Саюз—адзіная пакуль на зямлі дзяржава рабочых і сялян. Яна, наша соцыялістычная дзяржава, як перадавы аванпост чалавецтва, стаіць на завяваных у старога капіталістычнага свету пазіцыях, у гэтым найвялікшая заслуга нашых рабочых і сялян.

Але, будучы пакуль адзінай краінай соцыялізма, яна падвергнута заўсёды небяспецы ваеннага нападу звонку.

Таварыш Сталін днямі ў сваім адказе комсамольцу тав. Іванову сказаў, між іншым, наступнае:

«На самой справе было-б смешна і глупа закрываць вочы на факт капіталістычнага акружэння і думаць, што нашы знешнія ворагі, напрыклад фашысты, не паспрабуюць пры выпадку зрабіць на СССР ваенны напад. Так могуць думаць толькі сляпыя бахвалы або скрытыя ворагі, якія жадаюць усыпіць народ»

Гэтымі словамі таварыша Сталіна сказана ўсё.

Самая міралюбівая палітыка нашага Урада і народа не можа гарантаваць нас ад агрэсій.

Наш народ, яго магутная соцыялістычная дзяржава, Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот — вось тыя сілы, якія служаць адзінай перашкодай для агрэсіўнай, асабліва для фашысцкай часткі буржуазіі, якая рыхтуецца абрушыцца вайной супроць нашай Радзімы.

У тым-жа адказе комсамольцу тав. Іванову таварыш Сталін сказаў:

«Трэба ўсямерна ўзмацніць і ўмацаваць нашу Чырвоную армію, Чырвоны флот, Чырвоную авіяцыю, Асоавіяхім. Трэба ўвесь наш народ трымаць у стане мабілізацыйнай гатоўнасці перад тварам небяспекі ваеннага нападу, каб ніякая «выпадковасць» і ніякія фокусы нашых знешніх ворагаў не маглі засцігнуць нас знянацку...»

Вось палітычнае евангеліе і праграма дзеянняў для нашай дзяржавы, для ўсяго народа ў галіне знешняй палітыкі, у справе абароны сябе ад ваенных нападаў. **(Апладысменты).**

Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот — увесь асабовы склад узброеных сіл Совецкага Саюза, прыслухоўваючыся да слоў таварыша Сталіна,—будуць рабіць усё ад іх залежачае, каб яшчэ больш узмацніць і ўмацаваць свае рады, яшчэ больш упарта працаваць над удасканаленнем сваёй баявой магутнасці і быць нязменна гатовымі і абавязкова здольнымі не толькі даць належны адпор якому ўгодна і дзе-б там ні было нападаўшаму на нас ворагу, але і знішчыць яго, не дапускаючы на сваю совецкую зямлю. **(Апладысменты).**

Таварышы!

Нашы ўзброеныя сілы — гэта толькі перадавы атрад 170-мільённай арміі байцоў за справу соцыялізма, за вялікую справу Леніна—Сталіна. Яны ў авангардзе свайго магутнага народа ўскладзеныя на іх Урадам, партыяй, вялікім Сталіным задачы выканаюць поўнасцю. **(Апладысменты).**

Няхай жывуць нашы доблесныя Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот! **(Працяглыя апладысменты).**

Няхай жыве вялікі, магутны і непераможны совецкі народ! **(Працяглыя апладысменты).**

Няхай жыве слаўная пераможная партыя, партыя Леніна—Сталіна! **(Бурныя апладысменты).**

Няхай жыве наш вялікі Сталін! **(Бурныя, доўга незмаўкаючыя апладысменты, усе ўстаюць, воклічы: «Ура таварышу Сталіну!», «Няхай жыве маршал краіны соцыялізма таварыш Варашылаў!» Усе прысутныя наладжваюць авацыю таварышу Сталіну).**

В. Вольскі

Маршал К. Е. ВАРАШЫЛАЎ у творах беларускай совецкай паэзіі

Вершы, песні, паэмы, прысвечаныя Чырвонай Арміі, яе слаўным байцам, і непераможным камандзірам, знаходзім мы ў творчасці амаль усіх паэтаў БССР.

Вялікая колькасць паэтычных твораў прысвечана непасрэдна асобе правадыра Чырвонай Арміі, — жалезнаму наркому абароны, маршалу К. Е. Варашылаву. Гераічны вобраз палкаводца рэволюцыі даўно ўжо натхняе нашых паэтаў.

З ліку твораў, прысвечаных маршалу К. Е. Варашылаву і напісаных на працягу апошніх некалькіх год, асобнае месца займаюць «12 песень пра нашу непераможную Чырвоную Армію, пра яе творца і натхніцеля вялікага Сталіна, пра яе палкаводца Клімента Варашылава».

Дзівосны, легендарны жыццёвы шлях К. Е. Варашылава захапляў і захапляе выбражэнне народных мас. Народ ведае, што пераможнае завяршэнне гэтага шляху ад будкі чыгуначнага вартаўніка, у якой нарадзіўся Клім Варашылаў, да непераможнага маршала магутнай соцыялістычнай дзяржавы было магчыма толькі ў нашых умовах, ва ўмовах, створаных Кастрычнікам. Народ бачыць у Кліме Варашылаве яскравае ўвасабленне тых невычарпальных сіл, здольнасцей і талентаў, крыніцай якіх з'яўляюцца найглыбейшыя нетры народных мас нашай радзімы. Вось чаму так дорага народу мінулае таварыша Варашылава, вось чаму так цікавяцца масы юнацтвам, маладосцю і першымі рэволюцыйнымі крокамі свайго маршала.

У песні «Быў слесар Луганскі» аяўляецца слаўная рэволюцыйная маладосць чырвонага маршала.

Вобраз тав. Варашылава паўстае перад намі ў выглядзе маладога таленавітага рабочага. Малады слёсар куе для народа волю, сваімі спевамі ён абуджае народ да барацьбы за волю.

Вялікая колькасць вершаў пра К Е Варашылава звязана з выбарамі ў Вярхоўны Совет СССР Пісьменнікі ўдзельнічалі ў выбарах сваімі нарысамі пра лепшых людзей краіны — кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР, сваімі вершамі і непасрэднымі выступленнямі на перадвыбарчых сходах. Тут можна прыгадаць, між іншым некалькі вершаваных лозунгаў, створаных да перадвыбарчай кампаніі паэтамі П. Броўкам і П. Глебкам:

Самая моцная Армія — наша,
Ею камандуе сталінскі маршал.
Армія, танкі — за радам рад.
Клім Варашылаў — наш кандыдат
Кожны шчаслівы і кожны рад:
Клім Варашылаў — наш кандыдат.
Каб мірна, спакойна квітнела
радзіма —
Мы галасуем за маршала Кліма.

З вялікай радасцю сустрэў увесь беларускі народ паведамленне пра той гонар, які аказаў тав Варашылаў нашай рэспубліцы сваёй згодай балатавацца ў дэпутаты Совета Саюза па Менскай выбарчай акрузе

Гэта вялікая радасць беларускага народа ўвасабляецца ў вершы Янкі Купалы «Нашаму дэпутату».

У нашым Совецкім Саюзе не мала.
Хто нам пазайздросціць,—вось так
— з дабраты.
Дык ведайце: маршал даўно ўжо і
стала
Любіў Беларусь нашу й любіць,
браты!

Імя Клімента Ефрэмавіча заўсёды будзе жыць у сэрцах беларускага народа:

А сонейка будзе ўсходзіць, заходзіць,
Плысці будуць рэчкі, шумець будзе
бор,
Жыць будзе ў свабодным шчаслівым народзе
Імя палкаводца ад зорак да зор.

Цікавыя бытавыя малюнкі дае нам Купала ў двух сваіх вершах для дзяцей пад агульнай назвай «Выбары».

Малая Галінка расказвае, як яна прасіла сваіх бацькоў дазволіць ёй прыняць удзел у галасаванні і як маці адмовіла ёй, сказаўшы, што яна сама разам з бацькам панясе свой голас «за Сталіна за сонца», а Галінцы трэба пачакаць, пакуль яна падрасце.

У другім вершаваным малюнку для дзяцей старая бабулька, якая звычайна ўвесь час «сядзіць, не злазіць з печкі», збіраецца цяпер кудысьці з хаты, не гледзячы на тое, «што баляць ёй грудзі» Сямігадовы ўнучак Данілка просіць, каб яна асталася ў хаце, але старая гаворыць, што ідзе галасаваць за Варашылава

— Варашылава? — Я знаю,
Сам я з ім вітаўся, —
Ён, калі былі манеўры,
У нашым быў калгасе.
Ён адважны, дужы, смелы,
Чалавек *вядомы!*
Галасуй, ідзі, бабулька,
Я пабуду дома

У слаўным імені маршала Кліма ўвасабляецца ў вачах народа ўрачыстасць соцыялістычнай рэволюцыі У ім увасабляецца несакрушальная магутнасць нашай доблеснай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі Пад яго выпрабаваным кіраўніцтвам Чырвоная Армія пільна і нястомна ахоўвае ад ворагаў свяшчэнныя, недатыкальныя рубяжы вялікай краіны соцыялізма. Чырвоная Армія на чале з сваім кіраўніком заўсёды на варце Пра гэта ў мужных, урачыстых тонах піша Кандрат Крапіва ў сваім вершы «Жалезны маршал».

Спакойна сей, спакойна жні,
Даследуй ведаў глыбіні,
Працуй спакойна за станком:
— На варце працы друг-нарком —
Ён любы нам і страшны ім,
Жалезны маршал, родны Клім.

Значная колькасць паэтычных твораў, прысвечаных Варашылаву, напісана ў форме песень, але не ўсе яны адпавядаюць цалкам сваёй назве

Сапраўдная песня павінна быць простай, выразнай, эмацыянальнай. Акрамя папулярнасці зместу, вялікае значэнне набывае ў песні яснасць і рытмічнасць тэксту. Тэкст песні павінен быць разлічаны не для чытання, а для спеваў. Паслядоўнасць і сугучнасць слоў павінна быць такая, каб яны лёгка вымаўляліся і хутка засвойваліся. Радкі павінны быць кароткія, думкі — сціслыя, трапныя, лагічныя.

Нам здаецца, што якраз гэтыя якасці песеннага ладу ўдала ўвасоблены ў чырвонаармейскай песні: К. Крапівы «Пра Кліма легендарнага»

Сваім рытмам гэта песня нагадвае вядомую чырвонаармейскую песню пра конніцу Будзённага.

У песенным ладзе напісан верш Пятруся Броўкі «Любімы нарком» —

Мы можам спакойна
За працаю жыць.
Ён моцна на варце
Радзімы стаіць.
Праходзіць граніцай,
Калгасным сялом
Клімент Варашылаў,
Любімы нарком.

У другім сваім вершы — «Радасны дзень» П Броўка піша пра 12 снежня 1937 года, дзень выбараў, калі па ўсіх мясцовасцях вялікага неабсяжнага Совецкага Саюза народ ішоў аддаць свае галасы за Сталіна, за партыю, за лепшых сыноў сваёй соцыялістычнай радзімы. Паэт піша пра росквіт краіны соцыялізма:

Ёй красавацца і расці
Вялікай, дужай, маладой,
Хай толькі хто падыме меч,
Не вернецца назад.
Бо будзе пільна вартаваць
Магутны росквіт і спакой
Жалезны маршал, слаўны Клім,
Наш менскі дэпутат.

Народны паэт БССР Якуб Колас прысвяціў маршалу Варашылаву свой верш «Парад» Маршал аглядае ўзброеныя сілы Совецкага Саюза Бязмерна ўзрасла магутнасць Чырвонай Арміі:

Грознай лавай мкнуць тачанкі,
Сотні танкаў, цьма гармат...
Ці гадаў, прастор Луганкі,
Ты пра гэтакі парад?

З такой сілай можна смела глядзець у будучыню:

Хіба-ж пэўным быць не можна
З грознай сілаю такой?
Маршал бачыць час трывожны,
І ў душы яго спакой.

Верш «Варашылаўскія паходы» з'явіўся значным поспехам для паэта Міколы Хведаровіча. Гэта—лепшы з яго паэтычных твораў Радкі верша, хоць і не ўсюды роўныя па якасці, прасякнуты баявым пафасам. Аўтар спявае ў сваім вершы героіку грамадзянскай вайны, героіку цяжкай, самаадданай барацьбы супроць шматлікіх ворагаў, за совецкую радзіму Ён піша пра баявыя дні вялікіх паходаў.

Беларускі народ жыве на рубяжы з капіталістычным светам, на рубяжы з панскай Польшчай Адтуль пагражае совецкаму народу небяспека будучай вайны. На гэта ніколі не забываюцца народныя масы прыгранічнай БССР У выпадку нападу на СССР —

Падыме зброю ўвесь народ
Магутнае дзяржавы.
Ты павядзеш нас у паход,
Вялікі маршал славы.

Паэт Пятро Глебка ў сваёй «Песні пра наркома» таксама ўспамінае «мінулыя годы, суровыя бітвы і нашы паходы». Ён успамінае часы, калі —

За шчасце людское, за волю
радзімы —
На ворагаў лютых—да радасных мэт
Вёў нашу армію маршал любімы
І наш кандыдат у Вярхоўны Совет

Як і ўсе паэты ў сваіх вершах і песнях, прысвечаных наркому абароны, Пятро Глебка заканчвае свой твор радкамі, у якіх выяўляецца гатоўнасць народных мас да будучых баёў з ворагамі радзімы.

Ідэямі абароны бацькаўшчыны, пільнай аховы дзяржаўных межаў прасякнут верш Аркадзія Куляшова «Мы жывем на граніцы». Дзень выбараў у Вярхоўны Совет паэт называе днём «шчаслівага светлага свята»:

На шчаслівае, светлае свята
Выйдзе нашай акругі сям'я.
Кожны зноў урачыста і ўзнята
Прачытае наркома імя.
Бачым: танкі праносяцца міма,
Самалёты рыхтуюцца ў бой,
Гэта армія нашай радзімы
Засланяе граніцу сабой.

Пра вялікі ўздым, з якім рыхтаваліся да выбараў у Вярхоўны Совет працоўныя Менска, пра радасць галасаваць за Варашылава з натхненнем пісаў незадоўга да сваёй смерці заўчасна памёршы паэт Алесь Гурло:

З нас сёння кожны агітатар!
Мы ціснем горача руку
Табе, ад Менска дэпутату
І лепшаму большэвіку!

У вершы «Варашылаву — слава» пісаным у народным стылі, паэт Анатоль Астрэйка называе наркома абароны «сынам беларускага народа».

Маршал Варашылаў амаль кожны год наведвае Беларусь, кіруючы манеўрамі Беларускай ваеннай акругі. Беларускі народ не раз сустракаў на сваёй зямлі славутага палкаводца. Гэтай тэме прысвечан верш Міхася Калачынскага «Сустрэча наркома».

Ва ўсіх прыгаданых намі вершах адлюстроўваюцца з большай ці меншай сілай мастацкага ўздзейнічання тыя пачуцці, якімі ахоплены шырокія масы беларускага народа.

Клімент Ефрэмавіч Варашылаў блізкі і дарагі сэрцу народных мас нашай краіны.

У народнай свядомасці вобраз маршала Варашылава неадрыўна і арганічна звязаны з комуністычнай партыяй, з яе непахісным ЦК, з правадыром і настаўнікам народаў вялікім Сталіным.

„ЗАПАРОЖАЦ ЗА ДУНАЕМ“

НА САМАДЗЕЙНАЙ СЦЭНЕ

У старэйшым інстытуце БССР — Сельскагаспадарчым інстытуце ў гор. Горы-Горкі ўжо дваццаць год існуюць гурткі мастацкай самадзейнасці — драматычны, музычны, балетны. Ва ўсіх гэтых гуртках разам са студэнтамі ўдзельнічаюць навуковыя працаўнікі.

У 1925 годзе ў кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці інстытута ўзнікла думка аб сумеснай рабоце ўсіх гурткоў над операй. Спачатку было цяжка, трэба было шмат часу патраціць на падрыхтоўку гурткоўцаў, на элементарную музычную адукацыю, бо большасць удзельнікаў самадзейнасці не ведала нават нот.

Тры гады назад, калі быў створаны оперны калектыў — з хора ў 62 чалавекі, аркестра з 22 чалавек, балета з 25 чалавек і раду салістаў, вырашылі абраць для пастаноўкі украінскую оперу «Запарожац за Дунаем» Гулак-Арцемоўскага. Пастановачная частка была даручана К. Я. Рэкало, старому прафесійнаму актору, які з'яўляецца і зараз кіраўніком горацкага гуртка. Астатнімі кампанентамі оперы кіравалі самі ўдзельнікі самадзейнасці; аркестрам дырыжыраваў дацэнт матэматыкі З. М. Шапіра, хорам кіраваў дацэнт І. Л. Макаро, балет ставілі бухгалтар інстытута М. П. Гагарына і асістэнт метэаралогіі Н. Д. Суворава, мастацкае афармленне зрабілі дацэнт А. А. Кадрэвіч і студэнты Навіцкі, Малкаў, Несцярэнка, а касцюмы пашылі служачыя інстытута М. В. Рэкало, студэнтка Шумская, лабарантка Біруковіч ды іншыя. З вялікім энтузіязмам працаваў калектыў над першым сваім оперным спектаклем. Нарэшце, яны паказалі оперу ў Горках. Спектакль прайшоў з вялікім поспехам трынаццаць разоў.

Поспеху опернага спектакля, гэтай адной з складанейшых форм самадзейнага спектакля, спрыяла тое, што спектакль гэты быў пастаўлен і выканан вельмі культурна. Опера «Запарожац за Дунаем» у пастаноўцы калектыва мастацкай самадзейнасці Сельскагаспадарчага інстытута — рэдкая з'ява ў нашым самадзейным мастацтве. Гэты факт сведчыць аб вялікім росце мастацкай самадзейнасці БССР.

Такія выканаўцы, як лабарантка інстытута Ц. М. Блінчэўская ў ролі жонкі Карася — Адаркі, жонка навуковага работніка Д. Э. Шапіра ў ролі дачкі Карася — Аксаны, дацэнт І. Л. Макаро—выканаўца ролі казака-чорнаморца Андрэя і дацэнт Б. І. Якаўлеў у ролі Султана,—безумоўна таленавітыя людзі.

Запарожца Івана Карася, смешнага і жартаўлівага украінца нядрэнна выканаў К. Я Рэкало.

Ролі Селіх-Ага ў выкананні дацэнта І. А. Арлоўскага і Імама ў выкананні студэнта К. Зеніча сыграны гурткоўцамі добра.

Значна вылучаюцца ў гэтай оперы масавыя сцэны і добра зробленыя хормейстрам І. Л. Макаро хоры. Будучы чалавекам музычным, Макаро прабуе свае сілы і ў кампазітарскай творчасці. Ён уладае мастацкім густам, добра разумее меладычную украінскую музыку і ўмее перадаць свой вопыт гурткоўцам.

Прыемна чуць, што опера братняй рэспублікі ідзе ў нас на украінскай мове, прычым усе выканаўцы добра валодаюць гэтай мовай. Гэта сведчыць



«Запарожац за Дунаем» у пастаноўцы Горацкага сельгасінстытута.
НА ЗДЫМКУ: Д. Е. ШАПІРА ў ролі Аксаны і І. Л. МАКАРО ў ролі Андрэя.
Фота І. Каплінскага.

аб высокім культурным узроўні гурткоўцаў.

20, 21 і 22 лютага опера «Запарожац за Дунаем» у выкананні калектыва Горацкага сельскагаспадарчага інстытута была паказана грамадскасці Менска, якая сустрэла гэты калектыў надзвычай цёпла.

Калектыву мастацкай самадзейнасці Горацкага сельскагаспадарчага інстытута значна дапамаглі акторы Дзяржаўнага беларускага тэатра оперы і балета (тт. Каліноўскі, Гінзбург і Іваноў). Неабходна, каб Оперны тэатр і ў далейшым трымаў шчыльную сувязь з гэтым калектывам і клапатліва дапамагаў яму.

Першы вопыт пастаноўкі оперы на самадзейнай сцэне трэба вітаць. Такой арганізаванасці, сыгранасці і зрэпетыраванасці ўсяго калектыва можна было дабіцца толькі пры ўпартай працы, якую прарабіў горацкі калектыў на працягу трох год.

Спектакль «Запарожац за Дунаем» у пастаноўцы калектыва мастацкай самадзейнасці Горацкага сельскагаспадарчага інстытута — яркі прыклад культурнай пастаноўкі опернага спектакля. Опернае мастацтва трэба ўкараняць у рабочую і калгасную самадзейнасць.

А. ЕСАКОЎ.

ТВОРЧЫ ПОСПЕХ

Паказ опернага спектакля «Запарожац за Дунаем» сіламі гурткоўцаў Горацкага інстытута — вялікая справа, якая сведчыць аб значным росце самадзейнага мастацтва Совецкай Беларусі.

Самым радасным у гэтым спектаклі з'яўляецца хор і балет.

З салістаў вылучаюцца тт. Блінчэўская, Рэкало і Арлоўскі.

Партыя Адаркі ў выкананні тав. Блінчэўскай найбольш удалая з жаночых ролей. Вобраз Адаркі ў сцэнічным плане таксама выканан вельмі ўдала.

Бясспрэчна, што нервам спектакля з'яўляецца выканаўца партыі Івана Карася тав. Рэкало. У ім надзвычайна адчуваюцца артыстычныя магчымасці. Аднак, у некаторых лірычных мясцінах тав. Рэкало адцягвае ўвагу гледача ад партнёраў і вольнасцямі, непрадугледжанымі лібрэта, прыцягвае гэтую ўвагу да сябе.

Арлоўскі — здольны чалавек, але ў ролі Імама яму неабходна прасачыць за агульнай лініяй вобраза і не пераігрываць яе.

Партыю Андрэя выконвае тав. Макаро. Пры ўсёй яго шчырасці і цёплых адносінах да вобраза—галасавыя магчымасці яго яўна падводзяць. Гэта партыя з'яўляецца вельмі складанай у выканальных адносінах нават для выпрабаванага спевака-прафесіянала. Але ў даным выпадку трэба выходзіць галоўным чынам з вакальных магчымасцей удзельніка спектакля.

Партыя Султана ў выкананні тав. Якаўлева атрымоўваецца некалькі сарамліва-бяскроўнай. Голас прыемны, але патрабуе вялікай працы над сабой.

Аркестр прадстаўлен у гэтым калектыве ў вельмі скромным складзе як у колькасных, так і ў якасных адносінах. Сур'ёзнай перашкодай у ігры аркестра з'яўляецца адсутнасць добраякаснай аркестроўкі нот. Рад прыкрых пагрэшнасцей выходзіў якраз па гэтай прычыне. У далейшым трэба гэта ўлічыць і набыць пісьменна і правільна перапісаныя аркестровыя партыі.

Дырыжор спектакля тав. Шапіра рабіў усё магчымае, каб як найлепш звязаць усе кампаненты спектакля.

Спектакль «Запарожац за Дунаем» сведчыць аб тым, што ў калектыве Горацкага сельскагаспадарчага інстытута ёсць вялікая зарадка да стварэння опернага спектакля.

М. Э. ШНЕЙДЭРМАН,
дырыжор Дзяржаўнага беларускага тэатра оперы і балета.

ЗДОЛЬНЫ КАЛЕКТЫЎ

На старонках газеты «Літаратура і мастацтва» мне хочацца падзяліцца сваім уражаннем аб энтузіястах мастацкай самадзейнасці Горацкага сельскагаспадарчага інстытута.

Аркестрам кіруе дырыжор-самавучка тав. Шапіра, які працуе з вялікай любоўю і адданасцю.

Аб выканаўцах.

Тав. Шапіра мае добры голас. Ніколі не вучылася спяваць, але, пазаймаўшыся чатыры месяцы ў гуртку мастацкай самадзейнасці, яна нядрэнна авалодала гэтай справай.

Тав. М. І. Заламан з невялікім, але прыемным голасам. Уладае выключнай музычнасцю, здольная да сцэны. У выкананні ролі Аксаны ёсць жэманства, якое хутчэй уласціва гарадской паненцы, чым вясковай дзяўчынцы. Выключыўшы гэту памылку, вобраз Аксаны ў выкананні тав. Заламан можна было-б назваць поўнакроўным.

Выканаўца ролі Адаркі тав. Блінчэўская ўладае гучным, добрым голасам — лірычным сапрана. Партыю Адаркі праводзіць жыва, у тэмпе, з вялікім тэмпераментам.

Лірычны тэнар тав. Макаро музычна спраўляецца з партыяй Андрэя, але па сваіх нязначных вакальных дадзеных робіць гэту партыю напружана. Сцэнічна тав. Макаро слабей спраўляецца з сваёй роллю, таму што ён рассейвае сваю ўвагу і звяртае больш увагі не на ўласную ігру, а на выкананне абкружаючага яго калектыва.

Член калектыва тав. Якаўлеў мае сакавіты, мяккі, барытон. Пры ўпартай рабоце над сабой ён мог-бы дасягнуць у галіне спеваў значных поспехаў. Ён здольны да сцэны. Ролю Султана выконвае надзвычай добра.

Вопытны артыст тав. Рэкало партыю Карася праводзіць з вялікім тэмпераментам, уздымам, з сапраўдным артыстычным пачуццём. Тав. Рэкало павінен перадаць свой бліскучы вопыт актора опернай сцэны ўдзельнікам маладога калектыва мастацкай самадзейнасці.

Добра праводзяць свае ролі тт. Малахаў і Арлоўскі—Селіха-Ага, тт. Зеніч і Паўлоўскі — Імама.

Самая радасная з'ява гэтай оперы— хоры і масавыя сцэны балета. Асноўным недахопам усіх опер з'яўляецца статычнасць масавых сцэн. А ў гэтым калектыве масавыя сцэны зроблены найбольш жвава.

Добра і культурна пастаўлен танец «Гапак» тав. Івановым і танцы арабесак і арабчат — тав. Гагарынай.

Горацкі калектыў не павінен замыкацца ў рамкі інстытуцкай самадзейнасці, ён павінен больш прыцягнуць да сябе ў гурток таленавітых людзей—калгаснікаў і калгасніц свайго раёна.

В. В. КАЛІНОЎСКІ,
саліст Дзяржаўнага беларускага тэатра оперы і балета.

МЕНСКАМУ ГОРСОВЕТУ

Сяброўскі шарж Г. Дакальскай.



Калі слупы каля Эльвода
Пачне укопваць горсовет
І ставіць плот старою модай, —
Я весялей гляджу на свет.

Хоць знаю я, што ад паводкі
Не паратуе гэты плот,
Але ён сведчыць ужо чотка,
Што недалёк вясны прыход.

Што сходзяць дні зімы дакучлай,
Што холад зменіцца цяплом,
Што нас вясенька з песняй гучнай
Авее сонечным крылом,

Што стане больш прастору, свету,
Акадэмічных менш згрызот...
Вітанне шлю я горсовету
За весць вясны — за яго плот!

ЯКУБ КОЛАС.

СТВАРЫЦЬ УМОВЫ ДЛЯ ТВОРЧАЙ ПРАЦЫ І ВУЧОБЫ

Два гады назад у Полацку быў створан акруговы калгасна-соўгасны тэатр. За час сваёй працы ў тэатры маладыя акторы значна павысілі свае веды, паспяхова авалодваюць сцэнічным мастацтвам.

Спектаклі і канцэрты тэатра надзвычай цёпла прымаюцца гледачамі — працоўнымі горада і калгасаў акругі.

Калектыў тэатра з вялікім энтузіязмам жадае працаваць і вучыцца, каб ствараць высокамастацкія, задавальняючыя патрабаванні гледача спектаклі.

Аднак, умовы для паспяховай, плённай работы тэатра не створаны. Самая вялікая перашкода ў рабоце — адсутнасць добрага памяшкання, у якім-бы калектыў тэатра мог не толькі паказваць гледачам свае спектаклі, але і праводзіць палітыка-масавую і культурную работу.

Для сваёй працы калектыў мае невялікі пакойчык, які нагадвае камору. Пакойчык заняты шафамі і скрынямі з рознай маёмасцю тэатра.

Тэатр пасля «Вочнай стаўкі» пачаў працаваць над п'есай «Год 19», якую калектыў паказаў у дні дваццацігоддзя Чырвонай Арміі і Ваенна-Марского Флота. Але ўмовы, у якіх зараз знаходзіцца тэатр, перашкаджаюць далейшай творчай і вучэбнай рабоце калектыва.

Полацкі акруговы калгасна-соўгасны тэатр патрабуе дапамогі ад Полацкага акрвыканкома і Упраўлення па справах мастацтваў БССР. Умовы для творчай працы і вучобы калектыва калгасна-соўгаснага тэатра павінны быць створаны неадкладна.

А. МАЦЫЛЕВІЧ.

„У НАШЫ ДНІ“

ў Дзяржаўным яўрэйскім тэатры БССР

Ніхто не назаве п'есу Вашэнцава «У нашы дні» дасягненнем совецкай драматургіі. І можна не сумнявацца, што калі-б наш Яўрэйскі тэатр перад тым, як прыступаць да работы над ёй, прачытаў яе свайму гледачу і спытаў яго думку, дык атрымаў-бы аднадушную параду: не ставіць гэтую фальшывую, вельмі далёкую і ад нашых дзён, і ад мастацтва п'есу, не растрачваць на яе сілы і сродкі тэатра.

Сапраўды, што агульнага з нашымі днямі ў гэтых сахарынавых, згатаваных па дрэнных штампах сцэнах Вашэнцава? Заслужаны дзеяч мастацтваў Кузняцоў, які стварае нейкі выдатны твор за кулісамі, па ўсіх штампах «совецкага бадзёрага старога» непакоіцца за дачок-парашутыстак і хавае ад іх сваё хваляванне. Дачка яго Светлана, як лермантаўскі парус, «шукае буры»: маючы вялікія здольнасці да музыкі, кідае кансерваторыю, каб стаць інжынерам, а потым робіцца вайсковым лётчыкам, у часе вайны становіцца героем совецкай краіны. Акрамя рэзультатаў дзеянняў Светланы, аўтар амаль не дае ніякага матэрыялу для псіхалагічнага раскрыцця вобраза, для яго ўсебаковай характарыстыкі.

Другая дачка Кузняцова — Ніна, комсамолка, выдатная парашутыстка, не можа разабрацца ў натуры не толькі варожага нам па сваёй сутнасці, але і абсалютна чужога па сваіх вонкавых паводзінах, выклікаючага агіду ўжо адным сваім з'яўленнем на сцэне (так яго ахарактарызаваў аўтар) Ласса — яе мужа. Толькі выпадковая «псіхалагічная дэталь» раскрывае вочы Ніны, яна празрае. Усё тут фальшыва і нежыццёва. Не такія ў сапраўдным жыцці Ласс і яго матка, і не так адносяцца сапраўдныя Ніны да ворагаў. Ложнай сітуацыяй, у якую паставіў аўтар Ніну, ён фактычна кампраметуе вобраз комсамолкі.

Тое, што вобраз ворага Ласса (па намёках можна здагадацца, што Ласс займаецца шкодніцтвам па вытворчасці і яго там пачынаюць выкрываць) ахарактарызаваны ў тонах, па сутнасці, бытавой карыкатуры (Ласс проста рэўнівы, старамодны муж), сведчыць таксама аб палітычнай блізарукасці аўтара.

Цукерачныя ў п'есе вобразы чырвоных камандзіраў. Палкоўнік Крывашлык іграе на скрыпцы і перажывае свой стары раман з Нінай, а лётчык Стральцоў не ўмее іграць на скрыпцы і не ўмее перажываць; канструктар самалётаў Румша таксама перажывае ад няўдалага кахання да Светланы і зайздросціць Стральцову, што той лётае, а ён, Румша, па зямлі ходзіць. Гэта, бадай, усё, што можна сказаць пра гэтых герояў п'есы Вашэнцава, гэта, бадай, усе мастацкія фарбы, якімі яны ахарактарызаваны.

Цяжка было-б пераказваць змест п'есы. Першыя два акты пазбаўлены ўсякага драматызма, фактычна—усякага зместу. Гэта салодка-ружовая вадзічка «добрага жыцця» — некаторыя аўтары разумеюць шчаслівае совецкае жыццё, як мяшчанскі добрабыт.

Сэнс п'есы — у III акце, дзе паказана будучая вайна на Заходніх рубяжах нашай радзімы. Зразумела важнасць і цяжкасць такога паказу. Можна было-б многае дараваць аўтару, калі-б гэты паказ будучай вайны яму ўдаўся.

На жаль, гэтага сказаць нельга. Вобраза будучай вайны з фашыстамі аўтару стварыць не ўдалося. Ні сур'ёзнасці гэтай вайны, ні сапраўднага гераізма совецкіх людзей, ні працэсаў, якія адбываюцца ў фашысцкім тылу, з п'есы па-сапраўднаму нельга адчуць.

Безжыццёвая, наскрозь стылізаваная мова («пад старую» — мова Нілаўны, «пад рамантычную дзяўчыну» — мова Светланы і г. д.) усіх персанажаў п'есы.

Законна пытанне: няўжо ў Яўрэйскім тэатры не бачылі заганаў п'есы Вашэнцава? Бачылі, безумоўна. Чаму-ж тэатр узяў гэтую п'есу ў работу? Думаем, што гэта не проста выпадковасць, што гэта трывожная з'ява, якая мае свае прычыны і на якой неабходна завастрыць увагу калектыва тэатра.

У часы, калі Дзяржаўным яўрэйскім тэатрам кіравалі ворагі народа, якія наўмысля скіроўвалі яго са шляху соцыялістычнага рэалізма, наўмысля выганялі тэмы совецкай рэчаіснасці з рэпертуара тэатра, совецкая грамадскасць не адзін раз абвінавачвала тэатр за тое, што ён не ставіць совецкіх п'ес і, у прыватнасці, п'ес на абаронную тэматыку. Ачышчаючыся ад варожых элементаў, калектыў тэатра



«У нашы дні» Вашэнцава ў Дзяржаўным яўрэйскім тэатры БССР. ЗЛЕВА НАПРАВА: дзядзя Гоп — арт. В. Г. ЛІМОН; Максім Максімыч — арт. М. О. РЫВІН; Ніна — арт. П. Т. ВОЛЬПІНА; Нілаўна — арт. Р. КАПЛАН; Румша — арт. М. С. БЯРОЗКІН. Фота І. Каплінскага.

стаў на шлях ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў тэатры. Можна не сумнявацца, што калектыў Яўрэйскага тэатра шчыра жадае стварыць сапраўдны совецкі, высокай ідэйнай і мастацкай якасці тэатр.

Але ў некаторых кіруючых работнікаў тэатра існуе занадта лёгкае ўяўленне аб гэтай рабоце. Ім здаецца, што дастаткова браць совецкія п'есы, іграць «без фармалістычных трукаў», каб тэатр стаў рэалістычным і задавольваў патрабаванні, якія да яго прад'яўляюцца. Забываюць гэтыя таварышы, што патрэбна яшчэ мастацкая якасць — і п'ес, і акторскай ігры, і рэжысёрскай работы. Толькі ствараючы глыбокія, хвалюючыя, праўдзівыя вобразы совецкіх людзей, тэатр дакажа, што ён стаў чэрпаць матэрыял для сваёй творчасці з совецкай рэчаіснасці, што актор, рэжысёр тэатра, як сапраўдныя совецкія мастакі, вывучаюць гэту рэчаіснасць, глыбока яе разумеюць і ўсхваляваны ёю. Фармальнай адпіскай нельга замяніць творчую работу. Вось чаму выклікае асаблівае супярэчанне і трывогу выбар іменна Яўрэйскім тэатрам п'есы «У нашы дні».

Тут справа ў прынцыпе падыходу да совецкай п'есы і падыходу да работы тэатра. Калі ў тэатры лічаць дастатковым узяць да пастаноўкі п'есу на совецкую тэму, не клапоцячыся пра якасць яе вырашэння, і на тым сваю задачу лічаць выкананай («перабудавалі рэпертуар»), тады таварышы яўна недаацэньваюць сур'ёзнасці тупіка, у які завяло тэатр былое шкодніцкае кіраўніцтва, і сур'ёзнасці задач, што стаяць перад тэатрам сёння. Калі-ж у тэатры думаюць, што совецкая п'еса абавязкова павінна быць слабай з мастацкага боку (магчыма, гэтым тлумачацца прымірэнчыя адносіны тэатра да дрэннай якасці п'есы), тады, значыць, у тэатры яшчэ бытуюць тэорыйкі, пушчаныя ў свой час у ход ворагамі народа ў гэтым тэатры.

Гэта не пустыя домыслы. Калі-б у тэатры ўсур'ёз адчувалі ўсю адказнасць стварэння рэалістычнага спектакля на совецкую тэматыку, тады кіраўніцтва пастаралася-б абраць для пастаноўкі такую п'есу, якая дапамагала-б, а не перашкаджала акторам у іх цяжкой і адказнай рашаючай рабоце— стварэнні вобразаў совецкіх людзей. Тут тэкст перашкаджаў акторам.

Схематычныя, а то і фальшывыя драматургічныя вобразы нельга пераўтварыць у жывыя сцэнічныя. Вопытны актор можа толькі надаць ім бачымасць жыццёвай пераканальнасці. У багатай галерэі яркіх вобразаў, створаных акторкай Арончык, вобраз Светланы, комсамолкі і парашутысткі — зусім новы і вельмі патрэбны для росту актрысы. Нельга не бачыць, што тав. Арончык сур'ёзна аднеслася да гэтай работы. Але не маючы матэрыялу для стварэння цікавага, змястоўнага вобраза, яна і не магла яго стварыць. Гледзячы на Арончык — Светлану, хочацца ўбачыць яе ў добрай совецкай п'есе, яна, безумоўна, можа ствараць хвалюючыя вобразы совецкіх герояў.

Ролю Ніны Кузняцовай выконвае артыстка Вольпіна. Яна атрымала матэрыял яшчэ больш няўдзячны, чым Арончык. Акрамя таго, роля гэта яўна не ў амплуа актрысы. Таму і ніякага намёку на жыццёвы, мастацкі вобраз не атрымалася.

Акторы Бярозкін, Сонкін, Герштейн аказаліся бездапаможнымі зрабіць штонебудзь з ролямі Румшы, Стральцова і палкоўніка Крывашлык.

Сказваецца ў гэтым спектаклі дрэннае выхаванне маладых актораў Яўрэйскага тэатра, якія не прывучаны ўзбагачаць унутранай акторскай тэхнікай вобразы, не імкнуцца глыбей раскрываць іх (наколькі гэта магчыма ў рамках данай п'есы). Калі няма ў ролях прывычных характарыстык, выйгрышных сітуацый, акторы, як Сонкін і Бярозкін, пры ўсіх іх добрых дадзеных, застаюцца бездапаможнымі перад сваімі ролямі, нічым не могуць (не віддаць нават спроб у гэтым напрамку) расквеціць іх, альбо, як Свірыноўскі (Петэр), карыстаюцца наігрышам для стварэння вобраза. Але і немаладыя, вопытныя акторы, як Рывін (Кузняцоў), Герштэйн (Крывашлык) і інш., не абнаружваюць свежасці ў падыходзе да вобраза, а галоўнае — у выкананні іх не адчуваецца ні адной сапраўды шчырай, глыбока прачутай ноткі, не адчуваецца думкі, замыслу. Тое, што ў паэзіі называюць «гладкапісам», характарызуе акторскае выкананне ў гэтым спектаклі.

І нават тыя акторы, што прарабілі добрую работу над сваімі ролямі (тав. Арончык, тав. Лімон — дзядзя Гоп і інш.), не змаглі ў гэтым спектаклі дабіцца цікавага мастацкага рэзультата.

Што да рэжысёраў спектакля (тт. Мойн і Трэпель), дык трэба сказаць, што яны прыклалі нямала сіл, каб знішчыць у п'есе асабліва фальшывыя месцы, каб перамагчы нудную аднастайнасць першых двух яе актаў.

Але ні купюры ў тэксце, ні спробы пастановачнымі прыёмамі скрасці нуду (напрыклад, канец 1 акта) не могуць выратаваць п'есы ў цэлым.

Рэжысёры, выступаючыя ў якасці самастойных пастаноўшчыкаў упершыню, паказалі творчую беспрынцыпнасць, працуючы над гэтай п'есай, думаючы выратаваць яе штучнымі прыёмамі.

Нельга не паставіць ім у віну і яшчэ таго, што сцэны, якія паказваюць будучую вайну, — найбольш адказныя ў спектаклі, — менш за ўсё прадуманы пастаноўшчыкамі. У 5-й карціне — перад паветранай атакай — няма атмасферы ўнутранага і нават вонкавага ўздыму, сцэна невыразная і неэмацыянальная. Няма ніякай розніцы паміж настроем гэтай карціны і карцінамі ў доме Кузняцовых: нешта мармыча Румша пра сваю зайздрасць да Стральцова і каханне да Светланы, сустрэча Светланы з Румшай, пісьмо ад Ніны да Крывашлыка... — усе яны быццам-бы толькі-што ўсталі з-за стала ў кватэры Кузняцовых.

Галоўны паказ вайны адбываецца ў 6-й карціне. Тут пастаноўшчыкі дапусцілі буйную палітычную памылку: справа малюецца ў спектаклі так, быццам адна за другою часці чырвоных збіваюцца з дарогі, таму што следуюць яны ў напрамку, які ім паказвае ляснік — агент фашысцкай разведкі. Толькі раскаянне жонкі лясніка, якая выкрывае мужа, выратоўвае чырвоных ад гібелі... Зразумела, што гэта смешная карыкатура замест паказу будучай вайны, так у сапраўднасці быць не можа.

Незразумела, чаму пастаноўшчыкі выкрэслілі тыя месцы ў п'есе, якія паказваюць на расслаенне сярод насельніцтва ў капіталістычных краінах, на работу комуністаў у фашысцкім тылу (па п'есе комуністы выкрываюць лясніка, а, акрамя таго, дарогу знайшлі самі чырвоныя часці, арыентуючыся па картах. Тут аўтар аказаўся больш граматным, чым тэатр).

Нядобрыя таксама ў гэтай карціне амаль паталагічныя паводзіны параненай Светланы. На што разлічаны гэтыя «жахі»?

Не гаворым пра рад дэталей у гэтай карціне, бязграматных з чыста вайсковага боку, якія паказваюць на несур'ёзны падыход рэжысёраў да паказу будучай вайны. Неахайнасці, непрадуманасці з боку пастаноўшчыкаў вельмі шмат у гэтым спектаклі.

Абагульняючы сказанае, паўтараем: не так важны факт стварэння Яўрэйскім тэатрам дрэннага спектакля, — выклікае сур'ёзную трывогу прынцып, прычына гэтай няўдачы. Есць няўдачы, якія карысней усякай удачы, — гэта няўдачы, якія прыходзяць на шляху пошукаў новага, на шляху росту. А ёсць няўдачы, якія прыходзяць ад мінімума патрабаванняў да сябе, якія ні да чаго новага не вядуць і нічому не вучаць. Такой няўдачай з'яўляецца спектакль «У нашы дні». Ён паказвае, што перабудова тэатра яшчэ далёка не закончана (наперакор запэўненням некаторых людзей у тэатры і па-за ім), што ёсць у тэатры нямала людзей, якія не разумеюць ўсёй сур'ёзнасці задач, што стаяць перад тэатрам, усёй сваёй адказнасці перад совецкім гледачом, якому тэатр на працягу многіх год не даваў поўнакаштоўнага совецкага спектакля.

Яўрэйскі тэатр БССР павінен стварыць такі спектакль, і ён можа ствараць такія спектаклі. Патрэбна паглыбленая і сур'ёзная работа калектыва і кожнага члена калектыва над вырашэннем гэтай неадкладнай задачы тэатра.

Акрамя іншага, спектакль «У нашы дні» яшчэ раз паказвае, што Яўрэйскаму тэатру патрэбны мастацкі кіраўнік, які здолеў-бы вучыць калектыў і весці яго ўпэўнена па шляху соцыялістычнага рэалізма.

М. ЮДЭЛЕВІЧ.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Друкарня «Звязды». «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, С...цкая 68, Дом пісьменніка. Тэлефон сакратарыята 25-394, рэдактара 20-831. Уп. Галоўлітбела № 4224.